КУЛЬТУРА

ТАВАРЫСТВА ПІСЬМЕННІКАЎ "ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ"

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 28 (1415)
13 ліпеня 2019 г.

Фота Андрэя СТАСЕВІЧА, БелТА.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ўручыў Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу "Віцебск — 2019" Ксеніі Галецкай.

Віцебск.

Першае Гран-пры — наша!

11 ліпеня ўрачыста адкрыўся 28-мы Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". І адразу з асабліва прыемных для нас навін.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў спецыяльнай узнагародай "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення" народную артыстку Украіны Таісію Павалій. За некалькі гадзін да гэтага на плошчы лаўрэатаў перад амфітэатрам была адкрыта яе зорка. Паводле традыцыі, Кіраўнік дзяржавы ўручыў таксама Гран-пры Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу "Віцебск — 2019". Да вялікай радасці, яго ўладальніцай стала менавіта наша канкурсантка — 11-гадовая Ксенія Галецкая (гл. "К" № 25).

У дзіцячым конкурсе, які праходзіў з 8 ліпеня, удзельнічалі прадстаўнікі 21 краіны, прычым з Вялікабрытаніі, Індыі і Ірландыі — упершыню. Яшчэ крыху статыстыкі — за 27 гадоў існавання фестывалю на ім адбылося амаль дзве з паловай тысячы мерапрыемстваў. Сёлета гэтыя лічбы значна павялічацца: зараз у Віцебску адзначаны ажно 23 фестывальныя пляцоўкі, на якіх пройдуць 192 фестывальныя падзеі. "Славянскі базар у Віцебску" выйшаў на 85 адсоткаў самаакупнасці, на яго канцэрты прададзена больш за 67 тысяч квіткоў.

На прэс-канферэнцыі, прысвечанай адкрыццю, міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар адзначыў, што фестываль заслугоўвае, каб ацаніць яго на навуковым узроўні: "Славянскі базар" змог захаваць сваю актуальнасць, бо ягоны вопыт асэнсоўваўся і трансфармаваўся ў новыя формы развіцця".

Працяг **на старонцы 6**

Фота Сяргея СЕРАБРО

Народная артыстка Украіны Таісія Павалій.

In memoriam

ШЛЯХ НЯПРОСТЫ, АЛЕ ПЛЁННЫ

10 ліпеня ва ўзросце 96 гадоў пайшоў з жыцця народны мастак Беларусі Віктар Грамыка. На старонках "К" майстра ўзгадваюць яго калегі.

ст. 2

Art-блог

ТРАДЫЦЫІ ЦІСНУЦЬ І НЕ АДПУСКАЮЦЬ

"К" наведала апошнія прэм'еры сезона — "Шляхціца Завальню, або Беларусь у фантастычных апавяданнях" у Купалаўскім і "Сірожу" ў тэатры беларускай драматургіі. Далучайцеся да абмеркавання.

ст. 8 — 9

Погляд з XXI стагоддзя

ФОРМУЛА СУСВЕТНАЙ СКРУХІ ВАДЗІМА СІДУРА

10 ліпеня ў Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстава твораў выдатнага савецкага мастака-авангардыста Вадзіма Сідура (1924 — 1986). Успамінамі пра творцу дзеліцца мастацтвазнаўца Барыс Крэпак.

ст. 15

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

Афіцыйна

НА ПАДСТАВЕ АРТЫКУЛА 249 КОДЭКСА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ АБ КУЛЬТУРЫ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПАСТАНАВІЛА:

за значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, адпаведны мастацкі ўзровень і творчыя паказчыкі прысвоіць званне Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь народнаму ансамблю танца "Пінская шляхта" Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

А таксама пацвердзіць такое званне адразу некалькім калектывам: народнаму ансамблю народнай музыкі "Выцінанка" Столінскага гарадскога Дома культуры, народнаму фальклорнаму ансамблю "Паазер'е" выкладчыкаў Пастаўскай дзіцячай школы мастацтваў імя Антонія Тызенгаўза, народнаму ансамблю народных інструментаў "Верас" Дзіцячай школы мастацтваў № 5 г. Гомеля, народнаму фольк-шоу балету "Альянс" Гімназіі-каледжа мастацтваў г. Бабруйска, узорнай эстраднай студыі "Росы" і ўзорнаму ансамблю танца "Зязюлечка" Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі "Росквіт" г. Бабруйска, узорнай дзіцячай эстраднай студыі "Вясёлыя ноткі" Цэнтра творчасці "Эверэст" г. Магілёва.

На падставе артыкула 250 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь пастанавіла прысвоіць званні "народны" і "ўзорны" яшчэ некалькім калектывам.

"Народны" — арт-групе "Вінс-акорд" Ляхавіцкага гарадскога Дома культуры Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай клубнай сістэмы, эксперыментальнаму тэатру-студыі "Пілігрым" Пінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, творчаму аб'яднанню "Белавежскія чараўніцы" Белавежскай дзяржаўнай дзіцячай школы мастацтваў, арт-гурту "Бульбаш" Добрушскага раённага Палаца культуры, студыі эстраднага вакалу Nova Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

"Узорны" — хору "Атлантыда" Ваўкавыскай дзіцячай школы мастацтваў, студыі выяўленчага мастацтва "АртМир" Ашмянскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі, вакальнай студыі "Консонанс" Гімназіі № 5 г. Гродна, музычна-драматычнай тэатральнай студыі "Бубенчики" Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры.

Страта

Шлях няпросты, але плённы

Пайшоў з жыцця Віктар Грамыка — народны мастак Беларусі, адзін са стваральнікаў феномена пад назвай "беларуская школа жывапісу". Ёсць вонкавыя адзнакі школы. Гэта, напрыклад, перавага той ці іншай колеравай гамы, подборка тэм і сюжэтаў, асаблівасці пластыкі. Але сутнаснае ў іншым. Школа ёсць, калі стылёва разнастайныя творы непадобных адзін да аднаго мастакоў складаюць пераканаўчую карціну нацыянальнай ментальнасці ў пэўны гістарычны час. Да гэтай справы Віктар Грамыка прыклаў і руку, і талент, і розум.



1941 год. Над Прыпяццю.

Віктар Грамыка паспеў адзначыць 96-ты год жыцця. Нарадзіўся ў Савецкай Беларусі, заспеў суверэнную Беларускую дзяржаву. У сваіх успамінах ён згадвае, што, калі ў дзяцінстве ў яго праявіліся мастацкія схільнасці, чалавек з немалым жыццёвым досведам яго з гэтым павіншаваў такімі словамі: "Маеш талент! Гэта небяспечна!" І сапраўды ягоны жыццёвы і творчы шляхі не былі простымі. Але былі плённымі. Пра гэта сведчаць напісаныя ім карціны.

Ніякімі словамі не выказаць адчуванні ад такой страты, але ўсё ж ніжэй прывяду ўспаміны пра творцу, пачутыя днямі ад ягоных калег.

"НАДАЎ КРАЯВІДУ ПАЧУЦЦЁВАСЦЬ"

Мастак Віктар АЛЬШЭЎСКІ:

— Я не буду арыгінальным, калі скажу, што ўнёсак Віктара Грамыкі ў скарбніцу нашага мастацтва цяжка пераацаніць. Асабліва, калі гаварыць пра пейзаж. Менавіта Віктар Грамыка надаў беларускаму краявіду пачуццёвасць у спалучэнні з манументальнай маштабнасцю. Гэта адзін з самых яркіх творцаў Савецкай эпохі — часу, калі быў утвораны той грунт, на якім мы трывала стаім і сёння, ад якога адштурхоўваемся ў нашых творчых пошуках і эксперыментах. Скончылася тая культурная эпоха разам са знікненнем з палітычнай карты свету Савецкага Саюза.

Пачынаючы з 1990-х гадоў, беларускае мастацтва мае іншыя эстэтычныя арыенціры, іншую філасофію, зрэшты скіравана на іншую аўдыторыю. Але мы яшчэ доўга будзем асэнсоўваць зробленае людзьмі творчых прафесій у Савецкі час. Так, былі ідэалагічныя каноны, але творчасць такіх асоб, як Віктар Грамыка, сілкавалася рэальным жыццём, якое ні ў якія каноны не ўплішчыш. Сёння карціны Віктара Грамыкі з'яўляюцца не толькі каштоўным гістарычным дакументам, але і своеасаблівым адбіткам беларускай ментальнасці ў тым няпростым часе.

"УЖО НАША КЛАСІКА"

Мастак Міхась БАСАЛЫГА:

— За мастака гавораць ягоныя творы. У гэтым

Ільны беларускія.

ВІКТАР ГРАМЫКА

(2 СТУДЗЕНЯ 1923 — 10 ЛІПЕНЯ 2019)

10 ліпеня ва ўзросце 96 гадоў пайшоў з жыцця народны мастак Беларусі Віктар Грамыка.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне родным і блізкім народнага мастака Беларусі Віктара Грамыкі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Кіраўніка дзяржавы.

— Прыміце мае глыбокія спачуванні ў сувязі з адыходам з жыцця выдатнага майстра сучаснасці, — гаворыцца ў спачуванні. — З жыцця пайшоў чалавек вялікага таленту, чыёй творчасцю па праву ганарыцца наша краіна. Работы Віктара Аляксандравіча, якія ўяўляюць з сябе ўзоры высокага мастацтва, прызнаны не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Віктар Грамыка выхаваў некалькі пакаленняў маладых мастакоў і стаў прыкладам самаадданага служэння Радзіме.

На 97 годзе жыцця памёр народны мастак Беларусі, прафесар, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ганаровы член ДНУ "Нацыянальная акадэмія навук Беларусі", член грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз мастакоў" Грамыка Віктар Аляксандравіч.

Жыццё Віктара Аляксандравіча было прыкладам самаадданага служэння Айчыне і нацыянальнаму выяўленчаму мастацтву. Ён унёс значны ўклад у развіццё, захаванне і ўзбагачэнне традыцый нацыянальнага жывапісу. Дзякуючы яго непаўторнаму яскраваму таленту ў Беларусі нарадзіліся сапраўдныя творчыя шэдэўры. Творы майстра жывапісу знаходзяцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя Пятра Масленнікава, Трацяцкоўскай галерэі ў Маскве.

Як адзін з прызнаных лідараў нацыянальнай школы жывапісу Віктар Аляксандравіч унёс значны ўклад і ў выхаванне некалькіх пакаленняў мастакоў, імёны якіх з'яўляюцца гонарам айчыннага выяўленчага мастацтва. Творчая дзейнасць Віктара Аляксандравіча Грамыкі неаднаразова была адзначана высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выказвае спачуванні родным і блізкім мастака.

Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз мастакоў" смуткуе ў сувязі са смерцю Грамыкі Віктара Аляксандравіча, народнага мастака Беларусі, лаўрэата Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, прафесара, які ўнёс неацэнны ўклад у развіццё і прапаганду беларускага выяўленчага мастацтва. Рада ГА "БСМ" выказвае спачуванне родным і блізкім у сувязі з напаткаўшым іх вялікім горам.

Калектыў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Віктара Пятровіча Замяталіна і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Намеснік галоўнага рэдактара — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **агляльнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Настасся ПАНКРАТАВА, Антон РУДАК, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Таццяна ПАШЭНЬКА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2019.
Наклад 3566. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 05.07.2019 у 19.00. Замова 2312.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

сэнсе месца Віктара Грамыкі ў нашым мастацтве заўжды будзе пачэсным, незалежна ад таго, як новымі пакаленнямі будзе трактавацца час, ў які гэты творца жыў і працаваў. Ад сябе ж зазначу, што яму было вельмі нялёгка спалучаць на справе творчасць і функцыі адміністратара, бо пэўны час ён узначальваў наш Саюз мастакоў. Пасада лічылася наменклатурнай, людзі на ёй былі падкантрольныя непасрэдна ЦК КПБ. У іпастасі прадстаўніка ідэалагічнай наменклатуры ён мусіў рабіць тое, што як мастаку яму было і нецікава, і непатрэбна. Памятаю, ён атрымаў партыйную вымову за тое, што станоўча характарызаваў маладога мастака для паездкі ў замежжа, а той узяў і ў тым замежжы застаўся. Гэта сёння едзь, куды хочаш — хоць на нейкі час, хоць назаўсёды, а тады... Думаю, у больш спрыяльных для творчасці ўмовах ды маючы магчымасць засяродзіцца выключна на творчасці, ён і зрабіў бы болей. Але нават тое, што зроблена — ужо наша класіка.

"АДЗІН З АПОШНІХ ВОЛАТАЎ ВЯЛІКАЙ ЭПОХІ"

Мастак, старшыня Беларускага саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА:

— Можа, гэта і гучыць пафасна, але з жыцця пайшоў адзін з апошніх волатаў вялікай эпохі ў нашым мастацтве. У часовым вымярэнні яна прыпадае недзе на перыяд з сярэдзіны 1960-х па сярэдзіну 1980-х гадоў. Але такога плённага для мастацтва часу ў нас не было ні раней, ні пазней. Зрабілі ж тое 20-годдзе эпохай, можна сказаць, дзясятак асоб, сярод якіх і Віктар Грамыка. Лічу ягонай вялікай заслугай тое, што ён унёс лірычныя ноты ў драматычны аповед пра Вялікую Айчынную вайну, пры гэтым ні на крок не адступіўшы ад гістарычнай праўды. Без Віктара Грамыкі немагчыма ўявіць не толькі згаданы час у нашым мастацтве, але ўвогуле беларускую культуру.

"ЗДОЛЕЎ УБАЧЫЦЬ БЕЛАРУСЬ З НЕЧАКАНАГА ГЛЕДЗІШЧА"

Уладзімір ТОЎСЦІК:

— У ягоных карцінах мяне вабіць майстэрскі выбудаваная кампазіцыя палатна і рэжысура святла. Я найперш маю на ўвазе пейзажныя палотны. У іх Віктар Грамыка здолеў убачыць Беларусь з нечаканага гледзішча. Ужо аднаго гэтага хопіць, каб гэты творца застаўся ў гісторыі нашага мастацтва.

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Іскры ды танцы ў "Ночы"

На мінулым тыдні ў Мінску распачаліся здымкі новага кліпа да песні "Ноч" гурта ili-ili. Карэспандэнт "К" напрасіўся паўдзельнічаць у іх і ўжо спяшаецца распавесці, як гэта — стаць часткай масоўкі ў музычным роліку.

Гурт ili-ili быў створаны ў 2011 годзе. Касцяк калектыву складаюць яго заснавальнікі — акцёры Купалаўскага тэатра Міхаіл Зуй і Дзмітрый Есяневіч. Зараз у складзе групы таксама — артыст аркестра тэатра Эрык Арлоў-Шымкус, бубнач Ігар Юшкевіч ды гукарэжысёр Віталь Кулеўскі. Для апісання творчасці ili-ili лепш за ўсё падыходзіць тэрмін "інды-рок". Некалькі месяцаў таму выканаўцы прэзентавалі новую песню "Ноч". Твор выклікае ўражанне нечага вельмі інтымнага і пяшчотнага, распавядае пра блізкасць і каханне ў начным горадзе. Цікавы трэк, аднак, яшчэ не мае відэаінтэрпрэтацыі.

Тым часам у прыватнай кінашколе Андрэя Палупанава правялі конкурс для навучэнцаў па курсе "Кліпмэйкер". Так сталася, што акурат песня "Ноч" і перамагла ў своеасаблівым тэндэры — сямі рэжысёрам-пачаткоўцам было прапанавана зрабіць кліп (кожнаму адводзіцца па 30 секунд хронаметражу). Настаўнікі і галоўныя памочнікі на здымачнай пляцоўцы — рэжысёр Андрэй Грынько, які вядомы як суаўтар першага беларускага слэшэра "Крывасмокі" (яшчэ не выйшаў у пракат) і аператар Аляксандр Алейнікаў.

Дакладна перадаць сюжэт відэа складана. Надта асацыятыўным будзе аповед! Тым больш канцэпцыя, па словах адной з рэжысёрак Ксеніі Сярогінай, пакуль увесь час змяняецца і набывае новыя сэнсы. З упэўненасцю можна сказаць, што нас чакае нешта вельмі цікавае. Каб пранікнуць у прыроду кахання, паказаць складанасць і неадназначнасць гэтага пачуцця, па словах аўтараў, яны паспрабуюць выкарыстаць усе магчымыя выразныя сродкі кіно. Трэба дадаць, што самі музыкі ў роліку не здымаюцца.

Такім чынам, нашы героі — дзяўчына і хлопец — па сцэнарыю павінны першы раз сустрэцца на начной тусоўцы. Менавіта ў эпізодзе, які здымалі першым, — пакуль толькі позіркамі, але паміж імі запальваецца іскра. Эпізод з дыскатэкай стане скразным, да яго часта будзе вяртацца аповед. І менавіта на яго здымкі, што праходзілі на Камернай сцэне Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, я і патрапіў у ліку іншых "акцёраў масавых сцэн".

На пляцоўцы цемра, адзіныя асвятляльныя прыборы — даўгія лямпачкі кіслотных тонаў: чырвоныя і блакітныя. Яны ствараюць эфект неонавага святла і час ад часу мігаціць. Быццам у сапраўдным начным клубе. Пасля працяглай настройкі апаратуры нас запрашаюць у цэнтр светлавога відовішча, каб стварыць вакол актрысы (Евы Анікей) жывую сцяну з калідорам для аператара.

— Стоп! — спыняе нашы перасоўванні рэжысёр Андрэй Грынько. — Мужчына, вы занадта яркая пляма! Вельмі вылучаецеся сярод астатніх! — звяртаецца ён да адзінага ў нашай кампаніі сталага чалавека з сівой галавой. — Станьце сюды, калі ласка.

"Танцуем!" — крычыць аператар. Вакол нас з'яўляецца штучны дым, уключаецца хуткая электронная музыка, і ўсе разам пачынаюць ліхаманкава дрыгацца пад яе. Трэба рухацца ненатуральна хутка, каб потым усё выглядала праўдападобна: камера здымае ў рэжыме запаволенага часу. Спачатку заданне выклікала цяжкасці, тым больш што нас прасілі паднімаць рукі ўгору "і каб была пластыка". Але ва ўсіх атрымалася.

Дык вось, пакуль мы танцуем, гераіня звяртае ўвагу на хлопца ў зале (Сяргей Хадзькоў). Гульня ў позіркі. Сыход дзяўчыны ў цемру. Герой страчвае прытомнасць, а мы ўсё... "Танцуем!" Затым, быццам ствараючы паэтычны кінематограф, калыхаем хлопца на руках. Тым часам за межамі кадра:

— О, Міхаэль! — на пляцоўку завітвае з кубачкам гарбаты ў перапынку паміж рэпетыцыямі Міхась Зуй.

— Кава з вяршкамі! Кава з вяршкамі! — таксама з рэпетыцыі пачаставаць артыстаў прыходзіць і Дзмітрый Есяневіч.

Бо і ў нас таксама перапынак — здымкаў на сёння ўжо хопіць. Рукі баляць, пот ліецца. Хаця тое, што здымалі некалькі гадзін, на экране мусіць пераўтварыцца ўсяго ў некалькі секунд.

Як хутка па завяршэнні працы над астатнімі эпізодамі адбудзецца прэм'ера кліпа, група яшчэ не вызначылася. Аднак пасля ўдзелу ў працэсе ў мяне ёсць упэўненасць, што глядзець кліп будзе не сумна, бо і само відэа ствараецца ў атмасферы лёгкасці, весялосці і творчай еднасці. Карацей, чакаем!

Мікіта ШЧАРБАКОЎ
Фота Ганны ШАРКО

"Перавёрнутая рэальнасць" Зоі Луцэвіч

10 ліпеня распачаўся другі этап выставы "Зоі" ў галерэі пад адкрытым небам "Мастак і горад". Плошчу Якуба Коласа з 16 мая ўпрыгожвалі працы Зоі Літвінавай, а зараз мінчане змогуць атрымаць асалоду ад творчасці Зоі Луцэвіч. Пераэкспазіцыя мае не толькі фармальнае значэнне: змена карцін Зоі "вялікай" на карціны Зоі "маленькай", як жартаўліва называюць мастачак, адлюстроўвае пераемнасць пакаленняў беларускай жывапіснай школы. Выстава будзе працаваць у Мінску да канца лета, а з 6 верасня распачнецца ўжо ў Брэсце.

Зоя Луцэвіч скончыла ў 1989 годзе Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя Аляксея Глебава, вучылася ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на манументальным аддзяленні, потым — у Дзюсельдорфскай акадэміі мастацтваў (Германія) на аддзяленні жывапісу. Акрамя Беларусі, выстаўлялася ў галерэях Аўстрыі і Германіі. Мастачка прызнаецца, што любіць выдумляць і рэалізм яе не цікавіць. Яе працы, нават партрэты і нацюрморты, насычаны ўражаннямі, жывымі пачуццямі, якія амаль што на інтуітыўным узроўні ўспрымаюцца гледачамі.

Як адзначыла сама Зоя Луцэвіч, супрацоўнікі Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура адабралі для вулічнай выставы працы з розных перыядаў, каб як мага шырэй прадставіць у экспазіцыі яе творчасць. Нездарма новая экспазіцыя носіць назву "Перавёрнутая рэальнасць" — гэтым выразам мастачка характэрызуе ўсю сваю дзейнасць. На плошчы Якуба Коласа можна будзе ўбачыць і графіку, і жывапіс, і калаж.

— Выхад мастака з прасторы музея і майстэрні — гэта цудоўна, — лічыць Зоя Луцэвіч, — бо сёння шмат хто не бывае там, але калі пройдзе паблізу выставы на вуліцы ўсё ж можа зацікавіцца мастацтвам.

Валянціна КРАСОЎСКАЯ

Разбіць стэрэатыпы, каб стварыць індустрыю

МАСТЕРСКАЯ СОЦИАЛЬНОГО КИНО

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Конкурс кінапраектаў "Аб'ектыў_на: Правы дзіцяці", пітчынгі, адукацыйная праграма #Art_inclusion і падвядзенне яе вынікаў — гэта ўсё ініцыятывы апошніх месяцаў такой невялічкай арганізацыі, як Майстэрня сацыяльнага кіно. Тым не менш, незалежна ад сваіх памераў, кампанія актыўна шчыруе ў вобласці вытворчасці і прамоцыі ды нават пракаце сацыяльнага кіно, далучаючы да гэтай справы прафесіяналаў і аматараў. Як спалучаць у сваёй дзейнасці сацыяльную скіраванасць і ўласна кінавытворчасць? Якія тэмы "баляць" ці, наадварот, не заўважаюцца нашым грамадствам? І ў якім напрамку, увогуле, "дрэйфуе" наша кінаіндустрыя? Гэтыя ды іншыя пытанні мы закранулі ў вялікай размове з намеснікам дырэктара Майстэрні сацыяльнага кіно, прадзюсарам Канстанцінам ВАРАБ'ЁМ.

САЦЫЯЛЬНАЕ — НЕ ЗНАЧЫЦЬ НЯЯКАСНАЕ

— Канстанцін, сёлета вашай арганізацыі спаўняецца ўжо шэсць гадоў. Яе дзейнасць і высілкі іншых незалежных кінакампаній кажуць пра тое, што ў нашым кінаполі штосьці змяняецца. Пачнем з простага: ці сапраўды беларусам цікавае айчыннае кіно?

— Так, беларусы любяць кіно. Гэта пацвярджае і нядаўна праведзеная апытанка, зробленая, здаецца, адмыслоўцамі эканамічнага форуму. Сярод галоўных прыхільнасцей беларусаў — прагляд кіно. Каля 70 працэнтаў грамадзян штотыднёва глядзяць фільмы. Беларускія карціны, мякка скажам, не ў лідэрах, але, з іншага боку, гледача не асабліва і турбуе краіна-вытворца кіно. Галоўны крытэрый для іх — якасць. І вось тут назіраецца такі цікавы момант, што не толькі жанравыя стужкі карыстаюцца попытам гледачоў. Кіно, якое падымае праблемы, у якім гледачы могуць знайсці адказы на пытанні, што іх турбуюць, запатрабавана нароўні з жанравым. Давайце ўзнавім поспех такіх карцін, як "Нелюбоў" Андрэя Звягінцава ці "Завод" Дзмітрыя Быкава, каб пераканацца, што гэта сапраўды так.

— Добра, такое кіно беларусам цікава глядзець, а вось вырабляць?

— На прыкладзе нашай кампаніі магу сказаць, што з гэтым ёсць праблемы. Мы вось працуем ужо шэсць гадоў і ўвесь гэты час сутыкаемся са стэрэатыпам, што сацыяльнае кіно — гэта штосьці няякаснае, маруднае і маралізатарскае. Лухта. Так, мы прапаноўваем тэмы для рэфлексій у нашых кінаконкурсах, але гэта не значыць, што трэба да іх падыходзіць стэрэатыпна. На жаль, так адбываецца даволі часта.

— Распавядзіце, калі ласка, падрабязней.

— Калі мы аб'яўляем конкурсы на сцэнарыі, аўтары ўспрымаюць прапанаваныя тэмы ў даволі дзіўным ключы. Скажам, нядаўні конкурс "Аб'ектыў_на: Правы дзіцяці": з 30 сцэнарных заявак больш за трэць былі зроблены па клішэ. Вось вам адзін з самых распаўсюджаных сюжэтаў: хлопчык-сірата, якога ніхто не забірае з дзіцячага дома. Раптам здараецца цуд — і аднекуль за ім прыходзяць мама ці тата. Гэта значыць, што ў людзей ёсць такая ўстаноўка: маўляў, дзіцячае кіно — абавязкова сіроты ці штосьці такое. Прычым, калі мы даведаліся пра ўзрост аўтараў (а на конкурс у нас падаюцца зашыфраваныя сцэнарыі, таму мы не ведаем, хто за імі стаіць) — высветлілася, што пісалі падобныя заяўкі людзі 25 — 35 гадоў. То бок зусім не "зялёныя" асобы. Вось кінематаграфісты часта наракаюць на прадукцыю "Беларусьфільма", што яна надта прадказальная, але якая альтэрнатыва?

СУПРАЦЬ КЛІШЭ

— І як вы супрацьстаіце гэтай клішаванасці?

— Прыводзім да слухачоў экспертаў. Да прыкладу, запрашалі праграмнага дырэктара "Лістапада" Ігара Сукманава, каб ён распавёў пра дзіцячае кіно. У праграме Берлінскага кінафестывалю ёсць адмысловы конкурс, і там спаборнічаюць фільмы, што падымаюць пытанні талерантнасці, дыскрымінацыі, гендарнай роўнасці. Прытым разлічаныя на аўдыторыю 12+. І нікога не засмучае, што дзецям прапануецца такі сур'ёзны прадукт. Таксама ў Майстэрні выступаюць эксперты, якія могуць распавесці пра стан рэчаў у пэўнай сферы. Расказваюць проста страшныя рэчы. Напрыклад, пра масштабы булінгу, калі дзяцей травяць у школе, пра педафілію — гэта вельмі страшная тэма, пра якую кажуць і дзяржаўныя структуры. У выніку такіх сустрэч нараджаюцца паўнавартасныя праекты. Сёння мы маем у вытворчасці стужкі, што падымаюць такія складаныя пытанні. Гэта фільм "Цяхая Тая" Крысціны Шандалесавай і Віктара Бойкі, "План па дзецях" Яніны Рашчынскай, "На парозе маўчання" Кірыла Ярохіна і "Рыба маіх дзён" Дзмітрыя Рачкоўскага і Андрэя Крывецкага. Апошні фільм заўважылі на пітчынгу — пра ўплыў віртуальнай рэальнасці, калі бацькі функцыю выхавання сваіх дзяцей перадаюць гаджэтам. Як толькі пачынаеш капаць тэму глыбей — яна і раскрываецца.

— Цікава, а якія праблемы ўвогуле хвалююць беларускае грамадства? Якія тэмы запатрабаваныя?

— Шчыра скажу, што такой базы тэм у нас няма. Але імкнёмся працаваць з самымі надзённымі, паварочваючы іх у новым ключы. Магу прывесці прыклад нашага праекта "Кіна-дыялог", які мы рабілі ў 2015 — 2017 гадах. Для большасці людзей тэма Вялікай Айчыннай вайны звязана ў першую чаргу з вэтэранамі-франтавікамі. Але мы вырашылі зрабіць кіно пра былых вязняў канцлагераў, тым больш, што гэтых людзей таксама з кожным годам становіцца ўсё менш і менш. Абралі форму менавіта дакументальных стужак. Курыравалі курс знаныя дакументалісты Віктар Аслюк і Вольга Дашук.

І гэта быў менавіта такі дыялог паміж маладым пакаленнем і старэйшым — важна было ўсталяваць кантакт паміж імі. Цікава, што на першым інтэрв'ю былыя вязні распавядалі сваю гісторыю аўтарам — і тут жа закрываліся. Але нашы рэжысёры прыходзілі да герояў ізноў. "Дык я ж ужо ўсё распавёў?" — здзіўляліся яны. Але вось падчас гэтай паўторнай размовы і пачыналі раскрывацца. У гутарцы праскоквала штосьці асабістае, пэўныя душэўныя рэчы, рэальнае стаўленне да тэмы. Героі распавядалі, як яны зараз жывуць, пра што думаюць... Адпаведна, іначай гучала і вядомая тэма.

Самае цікавае, што ў рамках праекта "Белкіналета" паказваліся лепшыя работы нашых навучэнцаў. Падавалася б, складаная тэматычная скіраванасць, паказы стужак ладзіліся позна ўвечары, але ніхто з гледачоў — а гэта была пераважна маладая публіка — не сышоў з сеанса.

Экалогія (праект "Кінаспрынт", нагадаю, таксама наша ініцыятыва), талерантнасць, дыскрымінацыя, правы дзяцей — калі гэтыя надзённыя тэмы адлюстроўваюцца ў кіно таленавіта, нетрывіяльна — яны і запатрабаваны грамадствам.

МАЛЕНЬКАЯ МАДЭЛЬ ВЯЛІКАГА КІНО

— Апошнім часам сярод беларускіх кінематаграфістаў становіцца папулярнай і тэма інклюзіўнай супольнасці. Я разумею, што чым больш людзей будуць казаць пра праблемы інклюзіі, у тым ліку, сродкамі кіно — тым лепей. Але часам здаецца, што аўтары бяруцца за такое сацыяльнае кіно, каб проста быць у трэндзе. Вы таксама запусцілі сёлета адукацыйную праграму #Art_inclusion. У чым яе адметнасць?

— Дзеля справядлівасці адзначу, што тэму інклюзіі мы "ўзялі" яшчэ ў 2014 годзе, калі яна не была так распаўсюджана. Мы зацікавіліся ёю і з пункту гледжання расповеду пра людзей з асаблівасцямі, і з пункту гледжання іх уключэння ў творчы працэс. Тады ў нас быў праект "Новы погляд", а вось зараз #Art_inclusion. Сутнасць яго ў тым, што мы ствараем каманду, у якую ўключаем звычайных людзей і людзей з інваліднасцю — і яны разам робяць кіно. Прычым не абавязкова на інклюзіўную тэму.

— Цікава, атрымліваецца, што навучэнцы роўныя ў камандзе...

— Менавіта. Больш за тое, мы падбіраем каманду так, каб у групе былі не толькі людзі з асаблівасцямі, але аўтары розных узростаў, сацыяльных класаў, гендарнай прыналежнасці... Каб яны ў супрацы ўбачылі вартасці і недахопы свайго творчага прадукту і выпрацавалі пэўны механізм сумеснага дзеяння.

Увогуле, на такі праект мяне натхніла адна галівудская кінакампанія. У ёй мантажом займаюцца людзі з аўтызмам, уяўляеце? Мантаж — праца, якая вельмі вымотвае, не ўсе кінематаграфісты любяць ёй займацца. А вось людзям з аўтызмам, якія любяць працаваць з дэталямі, яна вельмі даспадобы. У выніку нарадзіўся такі геніяльны праект, калі ў плюсе ўсе, у тым ліку і індустрыя. Я разумею, што нам яшчэ да падобнай кампаніі далёка, але мы імкнёмся на прыкладзе хаця б нашых навучальных праграм стварыць такую мадэль — грамадства і кінаіндустрыі, якая потым можа быць перанесена на большыя формы і працэсы.

— Мы паступова перайшлі з сацыяльнага кіно на сацыялогію кіно. І які праект кінаіндустрыі вы прапаноўваеце?

— Па-першае, пакуль казаць пра беларускую кінаіндустрыю як пра тую, якая, скажам, выдае 50 поўнаметражных фільмаў у год, нельга. Але чаму мы не можам выкарыстоўваць досвед іншых краін у працэсе яе станаўлення, праўда?

Журы і ўдзельнікі пітчынгу "Аб'ектыў_на: Правы дзіцяці".

Кадры з фільмаў праекта "Кіна-дыялог": "Успамінаючы Азарычы" Кацярыны Нікановіч, "Нешта накшталт татуіроўкі" Максіма Шведа

Напрыклад, наймаць людзей з інваліднасцю на пэўныя спецыяльнасці ў кіно. Далей — пытанне той жа гендарнай роўнасці. Разумею, што яно ў нас не стаіць настолькі востра, таму што вялікіх грошай у кіна-індустрыі няма — і адпаведна поле канкурэнцыі за іх невялікае. Але чаму мы адразу не можам улічваць гэтыя моманты і трымаць баланс сіл?

— Згодна.

— Я за тое, каб мы выбудоўвалі нашу індустрыю так, каб яна ўлічвала ўсе тыя змены ў свядомасці, што сёння адбываюцца.

ПРОЗА ЖЫЦЦЯ

— Канстацін, усё слушна. Але што вы скажаце пра такія празаічныя рэчы, як кінафонд, конкурсы, пітчынгі, пракат?

— Мы над гэтым таксама працуем. Кінасупольнасці вядома наша дзейнасць па адвакацыі кінафонду, закандаўчых захадаў. Што датычыцца, да прыкладу, пітчынгаў і конкурсаў, то нават на прыкладзе "Аб'ектыў_на: Права дзіцяці", мы паспрабавалі зрабіць максімальна празрыстую працэдуру выбару праектаў. Мы запрасілі, у тым ліку, Аляксандра Рыдвана з Міністэрства культуры папрысутнічаць на пітчынгавым адборы. І яму спадабалася тая форма, што мы прапанавалі. Я не кажу пра тое, што мы намагаемся вынайсці ровар — падобныя механізмы даўно працуюць у іншых краінах, але імкнёмся праз мадэль сваіх праектаў прадэманстраваць, як гэта можа існаваць на практыцы на глабальным узроўні.

— Ведаю, што вашы высілкі па адвакацыі кінарэформаў успрымаюцца некаторымі людзьмі выключна ўтапічна…

— Гэта так. Склалася меркаванне, што я змагаюся за тое, каб усім маладым кінематаграфістам дзяржава давала на стварэнне кіно па сто тысяч ці то долараў, ці то еўра. Гэта не так. Я ж лабіруюсь больш глабальныя рэчы — стварэнне таго ж кінфонду, што вылучаў бы пэўныя сумы на прамоцыю беларускага кіно, дэбюты маладых, стажыроўкі кінематаграфістаў, гранты. Усё на канкурэнтнай аснове. Скажам, сёння ў нас у Майстэрню сацыяльнага кіно ідзе набор на курсы — і мы таксама выбіраем з кандыдатаў, што даслалі заяўкі. Мы не бярэм усіх запар. Сярод людзей з асаблівасцямі ў нас таксама конкурс. Канкурэнцыя мусіць быць, але павінна быць створана іншая сістэма каардынат. Нам патрэбна альтэрнатыўная стратэгія развіцця кінематаграфіі — вось што з'яўляецца мэтай маёй дзейнасці. Каб беларуская кінематаграфія пачала працаваць у рамках глабальнай кінасістэмы.

А ШТО ДАЛЕЙ?

— Вы адчуваеце, што за шэсць гадоў вашай практыкі ландшафт беларускай кінаіндустрыі змяніўся?

— Вядома. На базе кінастудыі і на базе прыватных кінакампаній пачалі здымацца кінаальманахі маладых рэжысёраў. Становіцца ўсё болей адукацыйных магчымасцяў для кінематаграфістаў: Індустрыяльная платформа "Лістапада", нашы адукацыйныя праекты, майстар-класы на "Паўночным ззянні"... Рэжысёры з большым поспехам збіраюць грошы на сваё кіно на краўдфандынгавых платформах. Яшчэ гадоў пяць таму была цалкам іншая сітуацыя. Таксама развіваецца культура ўзаемадзеяння паміж дзяржаўнымі структурамі і незалежнымі кінакампаніямі, што не можа не радаваць. "Крышталь" Дар'і Жук скарыў міжнародныя фестывальныя пляцоўкі. Пазітыўныя зрухі не адзначыць немагчыма, аднак... Калі мы параўнаем кінарух у той жа Украіне ці Грузіі, нашы змены выглядаюць проста мізернымі. Мы паранейшаму не з'яўляемся сябрамі буйных еўрапейскіх кінафондаў, а калі задумацца пра магчымасці для маладых — дык яны вельмі абмежаваныя.

— Як складваецца, дарэчы, лёс удзельнікаў вашых праектаў, навучальных праграм?

— Можам узяць самы паспяховы з іх — "Кінаспрынт", вынікам якога сталі тры рознажанравыя кароткаметражныя карціны: "2016", "Лічыльнік шчасця" і "Эстафета". Стужкі паглядзела больш за пяць тысяч чалавек, і для праекта сацыяльнага кіно, як вы кажаце, гэта зусім не дрэнна. Давайце паглядзім: Андрэй Крывецкі, рэжысёр "2016", зараз вучыцца ў ВГІКу і здымае фільм у межах нашага праекта. Ігар Чышчэня, што працаваў над "Лічыльнікам шчасця", здымае дакументальнае кіно на "Беларусьфільме". Міхаіл Пархоменка, аўтар "Эстафеты", вучыцца ў Маскве. Надзея Ількевіч, прадзюсар "2016", таксама вучыцца, але ў Штатах. Як бачым, маладыя людзі шукаюць магчымасці далейшага росту — і знаходзяць іх за мяжой. Больш за тое, магу зафіксаваць такую тэндэнцыю: многія, скажам смела, "нашы" аўтары прыходзяць да нас здымаць ізноў. З аднаго боку, гэта добра, бо яны хочуць заставацца ў прафесіі, з іншага — ім няма далей куды пайсці. А гэты выбар мусіць быць.

К

Пад чыс здымак фільма Яніны Рашчынскай "План па дзеях".



Удзельнікі адукацыйнай праграмы #Art_inclusion.

Дзяжурны па нумары

Адысея на чатырох колах

Аўтамабіль не раскоша, а сродак перамяшчэння? Толькі не ў тым выпадку, калі збіраешся ў тэатр. Магчымасць хуценька даехаць, каб забегчы ў глядзельную залу ўсё ж да таго, як уздымецца заслона, часта разбіваецца праз жорсткую рэальнасць: паркоўкі ля большасці тэатраў адсутнічаюць. Ад слова "зусім".

Настасся ПАНКРАТАВА

Возьмем самую тэатральную вуліцу сталіцы, на якой змешчаны адразу тры тэатры: Купалаўскі, Тэатр лялек і ТЮГ. Сюды мной пратаптаныя шматлікія сцежкі. Менавіта пратаптаныя: з метро лёгка патрапіць у кожны з будынкаў. А вось для вадзіцеля гэты тэатральны рай ператвараецца ў бермудскі трохкутнік, у якім ці сам заблукаеш, ці машыну страціш, бо ад эвакуатараў ніхто не застрахаваны.

Ля Купалаўскага маецца лапік умоўна названай паркоўкі. Хто першы прыехаў — той і заняў месца. Праўда, у выйгрышы часцей аказваюцца супрацоўнікі тэатра, якія, як ні круці, з'яўляюцца ля будынка раней за гледачоў. ТЮГу пашчасціла яшчэ менш: насупраць размешчаны гатэль і бальніца, таму любое гіпатэтычна свабоднае месца, не схаванае пад знакам "Паркоўка забаронена", хутчэй за ўсё будзе занята наведвальнікамі тых устаноў. Насупраць Тэатра лялек — Адміністрацыя Прэзідэнта, і побач ніяк не прыпаркуешся. Ёсць утапічная надзея знайсці кавалачак вольнага асфальту ва ўнутраным двары суседняга жылога дома. Аднак вы ж разумееце, што пачуеце (і — падкрэслю — справядліва!) ад тутэйшых жыхароў. Ды і паводле правілаў дарожнага руху гэта будзе парушэннем.

Хтосьці з'едліва зазначыць, навошта сунуцца ў цэнтр горада, калі ёсць метро. Слушна? Не зусім. Сітуацыі бываюць розныя. Маленькім гледачам тэатра лялек можа быць ад трох гадоў, а на вуліцы — залева, моцны мароз ці яшчэ якая анамалія прыроды. Прасцей было б пад'ехаць да будынка, каб хутчэй туды ўбегчы.

Ці іншая лагістычная задачка з асабістага досведу. Збіраемся з сынам на прэм'еру ў ТЮГ. На маё шчасце, ён ужо не немаўля, але зыходныя дадзеныя нашага намеру: спектакль пачынаецца а шостай, я знаходжуся ў рэдакцыі ў раёне Акадэміі навук, сын вучыцца ў другую змену на Паўднёвым Захадзе. Як дабрацца да глядзельнай залы да трэцяга званка, калі машыну, на якой я даімчу да гімназіі, дакладна няма дзе будзе паставіць? Па сакрэце скажу, што даўно вынайшла для сябе "перахватвальную" паркоўку: пакідаю аўто ля метро "Грушаўка" і дабіраюся да цэнтра на грамадскім транспарце. Толькі на Грушаўцы такіх хітрых становіцца ўсё болей, а адзіную грамадскую стаянку колькі часу таму закрылі з-за будоўлі шматпавярховіка. Што будзем рабіць, калі месца ўздоўж дарогі скончыцца (тамтэйшы прыватны сектар ужо абураецца наплыву "чужынцаў")?

Часцей за ўсё на перакладных даводзіцца дабірацца да Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Каб не вагацца ў антракце трохгадзіннага спектакля — ці з'ехаць зараз, ці застацца да канца, аднак быць гатовым, што дома апынешся апоўначы, стараюся ехаць туды на ўласным транспарце. Не так даўно ў былы будынак Маладзёжнага тэатра, што таксама месціцца непадалёк ад РТБД, перабраўся яшчэ і Тэатр-студыя кінаакцёра, так што навігатар у два разы часцей будзе шукаць вуліцу Крапоткіна. З бясплатнымі стаянкамі і там справы так сабе. Выратоўваюць парковачныя месцы ўздоўж трамвайнага шляху, якія ўвечары вызваляюць тамтэйшыя офісныя супрацоўнікі. І ўсё ж…

З усіх тэатраў хіба Вялікі можа пахвастацца афіцыйнай стаянкай для супрацоўнікаў і наведвальнікаў. Праўда, падчас "Балетнага лета" за 40 хвілін да пачатку спектакля тая паркоўка была запоўнена, на вуліцы Алаізы Пашкевіч транспарт не пакінеш (суседнія двары, зразумела, перапоўненыя "прыхаднямі"). І здзіўляцца няма чаму: зала разлічаная на 1200 гледачоў, што не скажаш пра пляцоўку для аўтамабіляў.

Пытанне з паркоўкамі самі тэатры разруліць не могуць. Таму ж Тэатру лялек, напрыклад, няма дзе захоўваць дэкарацыі — у гэтай сітуацыі зусім не да другасных пытанняў. Тут, хутчэй, чакаеш паразумецца з гарадскімі ўладамі. Сапраўды, ці не дзіва, што прыватныя гандлёвыя цэнтры думаюць пра наведвальнікаў змешчаных у іх кінатэатраў, дазваляючы ўладальнікам кінабілетаў пакінуць сваю машыну бясплатна на некалькі гадзін на паркоўцы, а дзяржаўным тэатрам даводзіцца рабіць выгляд, што яны вышэйшыя за гэтую праблему?

Застаецца толькі марыць, што калі-небудзь хаця б побач з тэатральнай вуліцай Энгельса з'явіцца выдаткаваныя для аматараў мастацтва машыны-месцы, дзе можна будзе па білеце на спектакль спакойна пакінуць чатырохколы рыдван, не баючыся пабачыць на экране смартфона званок бескампрамісна інспектара ДАІ.

К

Віцебск.

Першае Гран-пры — наша!

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.

Учора на фестывалі быў традыцыйны Дзень Саюзнай дзяржавы, які завяршыўся гала-канцэртам да 50-годдзя "Песняроў" і 20-годдзя самой Саюзнай дзяржавы. Паводле традыцыі, былі ўскладзены кветкі да Вечнага агня, адбылася паездка ў Здраўнёва, дзе, да ўсяго, прайшла медыясесія "Саюзная дзяржава: як перадаць моладзі наш культурны код". Напярэдадні ж дэлегацыя на чале з Дзяржаўным сакратаром Рыгорам Рапотам пабывала ў пасёлку Балбасава, дзе наведала мульцімадальны вытворча-лагістычны комплекс "Брэміна-Орша".

Пры ўсім захаванні традыцый неаднаразова падкрэслівалася, што фестываль набывае новы фармат. Насамрэч, больш правільна было б гаварыць пра новыя фестывальныя праекты, некаторыя з якіх, дарэчы, з'яўляюцца добра забытымі старымі. Так, чатыры ночы запар у Міжнародным прэс-цэнтры будзе праходзіць джазавы марафон. Канешне, ён адбудзецца ў новым фармаце, але падобны джаз-клуб дзейнічаў яшчэ на першых фестывалях і выклікаў тады неверагодны ажыятаж.

Значна павялічылася колькасць канцэртаў у зале "Віцебск", затое сёлета там не праходзяць спектаклі традыцыйнага праекта "Тэатральныя сустрэчы". Цалкам знікла кіно. Але ўпершыню прадстаўлены такі від мастацтва на мяжы са спортам, як балет на ільду: "Лебядзінае возера" і "Папялушка" з Санкт-Пецярбурга.

Увогуле, танцавальных імпрэз становіцца больш: дырэктар фестывалю, генеральны дырэктар Цэнтра культуры "Віцебск" Глеб Лапіцкі і іншыя арганізатары ўпэўнены, што фестываль можа быць не толькі вакальным, але і танцавальным. І ўсё больш маладзёжным!

Традыцыйны Дзень моладзі сёлета працягнецца два дні — 12 і 13 ліпеня. А некаторыя яго праекты і ўвогуле ахопяць ледзь не ўвесь фестывальны тэрмін: open air на плошчы Перамогі будзе доўжыцца пяць дзён — з 11 да 15 ліпеня. Сярод новаўвядзенняў — сённяшняя раніцняя вялікая зарадка на той жа пляцоўцы, дзе плануецца сабраць каля тысячы чалавек.

Тэндэнцыю да вядзення здаровага ладу жыцця адчулі на сабе і журналісты. Традыцыйны келіх шампанскага, якім нават у спякоту звычайна суправаджалася адкрыццё прэс-цэнтра, сёлета, нягледзячы на халоднае надвор'е, замянілі марозівам. Затое якім! Нашумелым "Белы полюс. Валошка" — блакітным ад валошкавых пялёсткаў, з насеннем лёну і ў вафлевым кубачку з жытнёвай мукі. Такім, якім некалькі дзён таму частавалі іншаземцаў у сталічным аэрапорце.

Дарэчы, пра замежных турыстаў "Славянскі базар у Віцебску" таксама паклапаціўся: па прыкладзе II Еўрапейскіх гульняў на фестывалі быў уведзены бязвізавы рэжым — з 1 па 20 ліпеня. Каб скарыстацца ільготай, дастаткова прад'явіць квіток хаця б на адзін з фестывальных канцэртаў. Ну, а ў тым, што на Віцебшчыне не засумуеш, пераконваць не трэба: гасцей гатовы прыняць і Полацк, і Орша, дый на Браслаўскіх азёрах — адпачынак незабыўны.

Невыпадкова сёлета і канкурсантам арганізавалі цікавыя экскурсіі. Удзельнікі дарослага конкурсу (іх, дарэчы, засталося 16, бо прадстаўнікі Кубы і Славакіі спаборнічаць не будуць) наведалі Палац Незалежнасці ў Мінску. А дзеці адпачывалі цэлы дзень — акурат пасля выканання абедзвюх песень, напярэдадні заключнага гала-канцэрта конкурсу. Спачатку іх павезлі на знакамітую віцебскую фабрыку "Віцьба", дзе яны ўявілі сябе кандытарамі і, вядома, пачаставаліся прысмакамі. А потым быў Полацк са сваімі славутасцямі — і, натуральна, знакамітым Сафійскім саборам, дзе спецыяльна для юных музыкантаў правялі арганны канцэрт.

Павялічваецца колькасць турыстаў і ўласна ў Віцебску. Многія мінчукі і іншыя жыхары Беларусі з'язджаюцца сюды нават не дзеля ўлюбёных зорак, а каб проста паблукаць у фестывальныя дні па горадзе. Заклаў гэту новую традыцыю "Славянскага базару" фэст вулічнага мастацтва "На сямі вятрах", які сёлета святкуе свой першы юбілей — праходзіць у пяты раз. З куды большым размахам і адметнай арганізацыяй. Не верыце? Прыязджайце і паглядзіце!

Больш падрабязна пра конкурсы і іншыя падзеі "Славянскага базару — 2019" чытайце ў наступных нумарах "К".

Фота Сяргея СЕРАБРО

Зараз у Віцебску праходзіць яшчэ і фестываль вулічнага мастацтва "На сямі вятрах", які распачаўся 11 ліпеня і працягнецца да 16-га. За мінулыя пяць гадоў ён стаў неад'емнай часткай фестывальнага віру, у якім жыве горад у ліпені. Вятроў там сем, бо менавіта столькі кірункаў прадстаўлена ў праграме фэсту: тэатр, паэзія, жывапіс, перформанс, фаершоу, харэаграфія, музыка. Якія, адкуль і навошта яны дзьмуць, распавяла "К" заснавальніца і мастацкі кіраўнік фэсту Улада ЦВІКІ.

Вераніка МОЛАКАВА / Фота аўтара і fest7vetrov.by

"Я Б НАЗВАЛА НАШЫМ ХЭДЛАЙНЕРАМ ГЛЕДАЧА"

— Па-ранейшаму ў нас застаюцца сем кірункаў і сем пляцовак: у Парку Фрунзэ, на вуліцы Талстога, у дворыку Цэнтра сучасных мастацтваў, на Пушкінскім мосце і на Пушкінскай плошчы, а таксама каля тэатра "Лялька", — нагадвае Улада Цвікі. — Прымаем сёлета каля сотні калектываў, а гэта амаль тысяча ўдзельнікаў. Прыкладна столькі ж было і летась. Раней мы лічылі афіцыйным адкрыццём карнавальнае шэсце, яно адбылося і гэтым разам, але там мы толькі прыгожа і ўрачыста прадставілі ўсе калектывы. Адкрываліся ж "Уверцюрай прома ветру" — пасля канцэрта адкрыцця "Славянскага базару" сабраліся каля ратушы, бо гэта самае віцебскае месца, і артыстычна нагадалі там пра дух і стыль нашага фэсту ды ўвогуле горада. А затым рушылі да пляцоўкі ў Парку Фрунзэ і зладзілі начную паці з тэатрамі і кавер-бэндамі. Мы хочам, каб не было ніякай сцяны паміж артыстамі і гледачамі, і актыўна прасоўваем у праграме гэты момант. Я б нават назвала гледача нашым сёлетнім хэдлайнерам — без актыўнасці публікі пад вялікім пытаннем поспех большасці мерапрыемстваў. Але мы ў ёй не сумняемся.

Сярод іншых адметнасцей адзначу выступ Raccoon Batucada Vitebsk (школа карнавальнай самбы і бразільскіх барабанаў. — **"К"**). У мінулыя гады ў нас выступала Raccoon Batucada з Мінска, потым яе кіраўніка запрасілі на майстар-класы да нас — іх вынік мы ўжо хутка пабачым. Яшчэ адна фішка — выступ Дзіцячага сімфанічнага аркестра з Валгаграда. А гэта 45 чалавек! Па горадзе будзе гуляць і 9-метровы цмок — велізарная лялька, з якой працуюць адразу восем чалавек. Карацей, аб'ём, які мы займаем у праграме "Славянскага базару", ужо вельмі вялікі.

"МОЦ ЛЮБОГА МАСТАЦТВА Ў ЯГО РАЗНАСТАЙНАСЦІ"

— Не крыўдуеце, калі вас не ўспрымаюць як асобную з'яву?

— На наш фестываль упершыню трапілі людзі, якія ехалі ўсё ж менавіта на "Славянскі базар", а не таму, што мы тут такія класныя. Іншая справа, што потым мы здолелі ўсіх утрымаць і працягваем гэта рабіць. Я б хацела, каб мы былі неад'емнай часткай "Славянскага базару" і па меры сваіх сіл і энергіі змянялі яго гісторыю ў лепшы бок. Галоўнае, каб у людзей быў выбар. Ну камусьці вельмі трэба пайсці на канцэрт шансона. Гэта ж так добра! Чалавек заплаціў за білет і атрымаў тое, што хацеў. Няхай так будзе. І няхай будуць музыканты, якія спяваюць каверы на вуліцы. Наўрад ці хтосьці з іх будзе спяваць на сцэне Летняга амфітэатра. Хаця хто ведае... Я не хацела б нікога крыўдзіць! Там выступаюць артысты, перад якімі я здымаю капялюш. Толькі моц любога мастацтва ў яго разнастайнасці. Таму я і разлічваю, што пасля канцэртаў людзі прыйдуць і да нас.

Хаця сама заўжды па-

"Мы адказныя за радасць у сваім жыцці"

ўтараю, што вулічныя артысты вельмі рызыкуюць — трымаць гледача, калі кожныя 20 метраў хтосьці іншы таксама працуе, складана. Але чалавек застаецца там, дзе яму цікава. Мне падаецца, гэта самае галоўнае — не адрэдагаваная тэлеверсія, а магчымасць глядзець менавіта туды, куды табе хочацца. Ідэя сямі вятроў-жанраў прадугледжвае такую магчымасць — пайсці і выбраць з рознага: слухаць гурты ці глядзець фаер-шоу, назіраць за тэатрамі ці нават далучыцца да іх. Нам самім цікава, што атрымаецца ў нас гэтым разам.

— Адна з традыцый фэсту — устаноўка своеасаблівых рэкордаў. Тут то чытаюць тысячу вершаў пра Віцебск, то тысячу разоў яго фатаграфуюць, то лічаць крокі пад гукі барабанаў. Што прыдумалі сёлета?

— У нас будуць не тое каб рэкорды, але дзве творчыя гісторыі. Першая — адкрыты майстар-клас для ўсіх ахвотных ад знакамітага віцебскага акварэліста Фелікса Гунема на Пушкінскай плошчы. Ён адбудзецца 13 ліпеня з 10 да 12 гадзін. Другая гісторыя — тысяча пацалункаў на Пушкінскім мосце. Таксама сёння з пяці гадзін вечара чакаем усіх. Прыходзьце, цалуйцеся! Там будуць і фатографы, каб гэта засняць, і артысты, каб стварыць адпаведны настрой. Мы не замахваемся на нейкія алімпійскія стандарты — проста будзем у гэта гуляць.

"ПУБЛІКА ГАЛАСУЕ НАГАМІ"

— Ці змяніўся за гэтыя пяць гадоў Віцебск? Ды ўвогуле ці бачыце змены ў вулічным жанры, на якія паўплывала з'яўленне вялікай артыстычнай майстэрні "На сямі вятрах"?

— Калі параўноўваць з першым фестывалем, бачна, што вырас агульны ўзровень удзельнікаў. Асабліва гэта тычыцца тэатраў. І харэаграфія вельмі вырасла. Усё наблізілася да вулічных стандартаў. Але большасць калектываў яшчэ застаецца ў фармаце аматараў. Хаця каго на вуліцы лічыць аматарамі і прафесіяналамі? Публіка ўсё адно галасуе нагамі. Падабаецца-не падабаецца — вось што важна, а не статус. Вось нашы музыканты за гэты час вулічнымі не сталі. Яны ўсё ж бліжэй да фармату open-air — развіваюцца, растуць, але хочуць сцэны з апаратурай. І я не лічу, што гэта дрэнна, хаця, канечне, мне шкада, што не прыязджаюць музыканты з тых, што спяваюць у пераходах. Але, магчыма, гэта і правільна — гукавая напоўненасць горада ў гэты час дужа вялікая. Вуліцы шумяць, і ўся атмасфера можа парушыцца. Перформеры да нас прыязджаюць, так мы называем і жывых статуй, але вось менавіта мастацкіх перформансаў я пакуль мала сустракаю. Прафесійныя тэатры, якія прыязджаюць на "Лялечны квартал", выходзяць на вуліцу — і гэта здорава! Час зараз такі хуткі, лічбавы... У што далей выльецца наша справа, складана прадказаць. Пяты фестываль — гэта проста рубеж, не больш за тое. Юбілей будзем святкаваць на сёмым фестывалі. Тады падумаем і пра вынікі.

— Але па водгуках і глядацкай актыўнасці ў час фестывалю адчуваеце, што людзі маюць патрэбу ў вулічнай культуры?

— Я скажу болей — нас шукаюць і ўжо загадзя даведваюцца, якіх падзей у праграме чакаць. Думаю, яшчэ крыху — і мы зможам ужо не прыкладаць асаблівых намаганняў, каб на вуліцы быў маскарад. Нам жа чаго хочацца? Не толькі папулярызаваць нашы калектывы. А яшчэ каб людзі вучыліся рабіць свята сабе самі. І не толькі ў час фестывалю. І не па камандзе. Вось калі ў цябе дзень народзінаў, ніхто не гаворыць: "Няхай будзе весела". Калі ты сам не захочаш, нічога не атрымаецца. Як мінімум свята, а як максімум — жыццё. Можна ж выбіраць, ці будзе яно радасным, ці шэрым і буднічным.

То бок уся справа ва ўменні праяўляць свае эмоцыі. І калі табе хочацца прайсціся ў шэсці з вулічнымі артыстамі — давай. Калі табе хочацца ўбачыць потым свой фотаздымак з пацалункамі — давай. Але ж для гэтага трэба хаця б прыйсці на той мост. Далей мы ўсё зробім — і сфатаграфуем, і выкладзем у інтэрнэт. Ты толькі зрабі крок. Затым прыйдзі на майстар-клас і памалюй. Чаму не? У нас ёсць некалькі студый, дзе займаюцца дарослыя, але чаму калі конкурс, то толькі дзіцячага малюнка? Мы чамусьці не ўмеем даваць сабе задавальненне. І я сама ў першую чаргу! Часам думаю, чаго б я хацела сабе, акрамя работы. Першая думка — выспацца і больш нічога...

— Вось пра гэта і хачу запытацца. У чым карысць гледачоў — відавочна. А артысты? Чым выманьваеце іх на вуліцы Віцебска?

— Канечне, мы быццам у парніку — намагаемся стварыць для ўсіх ідэальныя ўмовы, але якія ж яны ідэальныя? Людзі прыязджаюць і выступаюць за свой кошт. Мы толькі трымаем пляцоўкі і спрабуем выканаць райдэр, каб было камфортна працаваць. Хацелася б яшчэ бачыць мецэнатаў, ідэйных людзей. Магчыма, як арганізатары самі не ўмеем працаваць з тымі ж краўдфандынгавымі пляцоўкамі. Толькі нас ужо ледзь хапае на тое, каб усю гэтую фестывальную машыну развярнуць (касцяк фестывальнай дырэкцыі складаюць артысты народнага маладзёжнага тэатра "Кола". — **"К"**). Сэнс жа ў тым, каб праявілася гарадская ініцыятыва.

Віцебск — горад у добрым сэнсе вар'яцкіх гісторый. Дык давайце рабіць разам вар'яцкія майстар-класы, пленэры, прывозіць фантастычныя калектывы з-за мяжы. Самі мы не ў стане рабіць усё гэта. Напрыклад, з Валгаградскім дзіцячым аркестрам нам проста пашанцавала — яго прывезлі на спадарожны камерцыйны фестываль і мы змаглі прапанаваць пляцоўку для выступу на вуліцы. А гэта ж цуд, а не калектыў! З нашага капіталу ў нас пакуль ёсць толькі мы самі. Гэта тычыцца ўсіх і прымяняльна да чаго заўгодна. Фестываль скіраваны на тое, каб выцягнуць людзей з пасіўнага стану ў свядомы. Нягодаў нам заўжды ёсць каму даваць, а за радасць у нашым жыцці адказныя мы самі. Вулічныя артысты ведаюць гэта як ніхто!

К

Экспертная рада

Усе мерапрыемствы "На сямі вятрах" наведвае Экспертная рада, склад якой змяняецца штогод. Але задачы яе застаюцца нязменнымі: падзяліцца ўражаннямі ад убачанага і адарыць спецыяльным прызам калектыў, дзейнасць якога найбольш адпавядае агульнай задуме фэсту — ажыўляць гарадскую прастору. Слова даўнім сябрам фестывальнай рады.

"ВЯДУЧАЙ ТЭМАЙ ФЭСТУ ЗАЎЖДЫ З'ЯЎЛЯЕЦЦА САМ ВІЦЕБСК"

Маргарыта КОРЗУН, арт-менеджар, выкладчык, культуролаг, прадзюсар:

— "На сямі вятрах" — гэта фестываль, які прыносіць у горад дух сапраўднага Віцебска, таму што менавіта сам Віцебск заўжды з'яўляецца вядучай тэмай фэсту. У самы ж першы год яго галоўным героем стаў віцебскі вецер, а віцебскае неба "ўпала" на Пушкінскі мост, дзякуючы мясцовым мастакам. І кожны раз падчас фестывалю вуліцы Віцебска ажываюць. Вельмі добра, што гэта адбываецца падчас "Славянскага базару", бо раней людзі выходзілі з пляцовак і не ведалі, чым сябе заняць, а зараз яны ў любы час могуць стаць саўдзельнікамі нейкага творчага працэсу.

Гэты фестываль заўжды дае эмоцыі і дарыць свята гораду і яго жыхарам. І ён быў бы немагчымы без народнага маладзёжнага тэатра "Кола" і яго кіраўніка Улады Цвікі — штогод ім хапае таленту і моцы прыдумаць штосьці новае, задаваць настрой і стварацъ незабыўную атмасферу на вуліцах Віцебска, нягледзячы на надвор'е. Тут знайшлася асобная пляцоўка для фаер-шоу, на якое ўвогуле не ў любым горадзе даюць дазвол. І там паказваюць не дзяжурныя нумары з тых, што часам замаўляюць на карпаратывы, а сапраўды шоу, мастацтва, якое задае высокі ўзровень у сваім жанры. За пяць гадоў "На сямі вятрах" аб'яднаў шматлікія творчыя сілы Віцебска: да яго далучыліся паэты і складальнікі аўтарскай песні, мастакі, нават проста мінакі, якіх зацягвае карнавальнае шэсце. Інтэрактыў, сутворчасць — усё гэта заўжды было характэрна для віцебскага мастацтва і гэта галоўныя рысы вулічнага фэсту.

"ЛЮДЗІ ХОЧУЦЬ ІСНАВАЦЬ У КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЗ АБМЕЖАВАННЯЎ"

Валянціна КІРЫЛАВА, мастацтвазнаўца, арт-менеджар, заснавальніца Цэнтра сучаснага мастацтва ў Віцебску:

— Вось зараз праходзяць прэс-канферэнцыі з рознымі гасцямі, у іх пытаюцца, куды б яны пайшлі ў Віцебску, і ўсе кажуць пра фестываль "На сямі вятрах". Раптам аказалася, што ён адлюстроўвае сабой жаданні людзей, якія хочуць існаваць у культурнай прасторы без абмежаванняў. Таму ініцыятыва Улады Цвікі прыйшлася ўсім да душы і для яе рэалізацыі аб'ядналіся розныя гарадскія калектывы. Ёсць такое паняцце — арнамент масы. Вось чаму людзям здаўна хочацца яднання і яны, напрыклад, скачуць разам праз вогнішча ці пускаюць вянкі па вадзе і гэтак далей? Тады разам яны складаюць адзін малюнак — арнамент масы. Гэтак жа адбываецца і на фестывалі. Акрамя таго, ён дэманструе пэўную эстэтыку — у ім няма фармалізаванага кано-ну, затое ёсць шмат розных прыкладаў, якія стасункі могуць быць менавіта ў чалавека з чалавекам. Што ўплывае на фармат усіх іншых гарадскіх святаў, якія праводзяцца потым, — ён заўважна змяняецца, бо ў мерапрыемствах становіцца менш афіцыяльшчыны.

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 13 ЛІПЕНЯ 2019 г.

Фантастычныя апавяданні пра тое, куды ідзем

Кландайк для даследаванняў

У Купалаўскім — прэм'ера. І не абыякая — нацыянальная класіка XIX стагоддзя ў сучасным прачытанні: "Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях". Вядомы твор Яна Баршчэўскага ператварыў у п'есу Сяргей Кавалёў. Аншлаг!

Надзея БУНЦЭВІЧ

Прэм'ера ў Купалаўскім — заўжды крыху больш, чым проста новы спектакль. Гэта яшчэ і чарговы адказ на вечнае пытанне: куды ідзем? Не толькі таму, што тэатр па праву носіць званне Нацыянальнага акадэмічнага, збіраючы лепшыя творчыя сілы краіны, але і таму, што прызваны звяртацца да найбольш актуальных, а часам і балючых пытанняў нашага жыцця. Гэта ў новым спектаклі — спраўдзілася на ўсе сто.

Дарэчы, гэта не першы зварот купалаўцаў да згаданага твора. Ранейшы быў монаспектаклем Генадзя Аўсяннікава і амаль не адыходзіў ад добра скарочанага тэксту арыгінала, перакладзенага з польскай на беларускую: мы бачылі менавіта фантастычныя, заснаваныя на беларускіх паданнях гісторыі-аповеды, цудоўна прыпаднесеныя знаным артыстам, літаральна народжаным для гэтай ролі. Вось і ў цяперашнім спектаклі мы бачым Аўсяннікава — Шляхціцам. На гэтым параўнанні паміж пастаноўкамі заканчваюцца. І не толькі таму, што новы спектакль — густанаселены, як і колішняя аднайменная кінастужка Віктара Турава. Бо праца Сяргея Кавалёва не зусім інсцэніроўка, як пазначана ў праграмцы. На аснове асобных апавяданняў ён стварыў завершаную, добра складзеную п'есу з паслядоўна разгорнутай інтрыгай — па ўсіх законах драматургічнай класікі: экспазіцыя, завязка, кульмінацыя, развязка. Легенды спляліся адна з адной, з'явіліся скразныя героі, некаторыя з іх сталіся збіральнымі, іншыя — бы перанесенымі з аднаго аповеда ў другі. Больш акцэнтаванымі сталі развагі пра нацыянальную самасвядомасць і незалежнасць — ледзь не з тонка прыкладзенымі спасылкамі да найноўшых навуковых прац. І разам з тым узмацніліся паралелі з еўрапейскімі і сусветнымі архетыпамі, узніклі нават прамыя паралелі, уласцівыя постмадэрнісцкім прачытанням, што стала адметнасцю творчага почырку аўтара.

Параўнанне кнігі і спектакля — сапраўдны кландайк для даследаванняў. Не здзіўлюся, калі ў наступным вучэбным годзе з'явіцца безліч школьных сачыненняў ды курсавых на гэту тэму. Між іншым, яшчэ і таму, што спектакль абсалютна дакладна разлічаны на нашу сярэднестатыстычную (і, скажам шчыра, не самую "прасунутую" ў мастацкіх даляглядах) тэатральную аўдыторыю, уключаючы падлеткава-моладзевую. Тут ёсць усё, каб прыцягнуць публіку рознага ўзросту, куды маладзейшую за пазначанае тэатрам 16+ (пэўна, на ўсялякі выпадак, каб ніхто не прыдраўся).

Акцёрскі склад — зорны. Асабліва вылучаюцца Іван Трус (Доктар Шэльмер) і Аляксандр Казела (Белая Сарока), якія не маюць, як гэта заведзена, "дублёраў". Іван вярнуўся ў сталіцу, прайшоўшы выдатную школу (ды што там школу — майстар-класы!) рэжысёра Саўлюса Варнаса ў Магілёве. Чаго каштуе адно тое, як ён умее трымаць паўзу. У Аляксандра адразу заўважна асаблівая музычнасць — ужо ў тым, як ён прыпадносіць сябе ў адметным строі. А як змяняецца Раман Падаляка (Пан Альберт), калі ў яго ўсяляецца Нячысцік!

Увогуле "карцінка" — вышэйшага ўзроўню, прычым зразумелая нават дзецям і зусім не страшная. Каларытны чарот, што апускаецца ў багну і зноў узрастае. Маштабная выява Чорнага пеўня з вокам-поўняй. Надзетыя на артыстаў маскі-галовы Ваўкалака, Цмока, Калядоўшчыкаў — прамыя спасылкі да вялізных арыгамі. А сам Цмок, якога артысты праносяць "у поўную велічыню", бы навагодняга кітайскага дракона, аказваецца шкілетам гэткага дыназаўрыка. Ёсць і вялізная Рыбіна, што з'яўляецца з-пад ільду, бы Шчупак з казкі пра Ямелю. Што ні кажыце, а спектакль, дзякуючы працы мастакоў Кацярыны Шымановіч (сцэнаграфія) і Сяргея Ашухі (касцюмы) ушчэнт разбівае міф пра тое, што ў жанры фэнтэзі тэатр ну ніяк не можа спаборнічаць з кінематографам.

Касцюмы рэальных персанажаў таксама вельмі стыльныя: фольк і шляхецтва ў іх азначаныя ўмоўна, але вельмі дакладна. Частка строяў увогуле магла б скласці добрую дызайнерскую калекцыю, прызначаную для вытворчасці. Дый колеравыя спалучэнні, не пазбаўленыя асацыятыўных шэрагаў, радуюць вока. Шыкоўна дапаўняюць відовішча пластыка і танцы, пастаўленыя Вольгай Скварцовай, якая праз гэта і адметныя характары героям надала, і народныя скокі зрабіла ў меру фолькавымі — і ў меру фантазійна-сучаснымі.

Гэтак жа і музыка Віктара Кісценя, пабудаваная на спалучэнні розных полюсаў. Белая Сарока знітавана з барочнай цытатай. Сяляне — з аўтэнтыкай (між іншым, у такой манеры ўжывую спяваюць самі купалаўцы, што робіць ім гонар), апрацоўкай і стылізацыяй народных матываў. А колькі кампазітарскай фантазіі ў драматычных сцэнах, звязаных з адмоўнымі персанажамі! На жаль, тыя моманты не заўжды становяцца магутнымі кульмінацыямі, як гэта, пэўна, было задумана: запіс (па меншай меры, на перадпаказе) уключаўся часам надта ціхутка, бы нейкі шоргат-шамаценне. Фонасферу спектакля выдатна дапаўняюць і мікрафонныя рэплікі, і гучанне жывых інструментаў у запісу, што "разбаўляе" камп'ютарную аранжыроўку. Адзінае, чаго ў гэтым складніку бракуе, дык гэта нейкай агульнай "звышканцэпцыі", да якой схільны ў падобных выпадках той жа Уладзімір Кур'ян, які працуе ў Купалаўскім загадчыкам музычнай часткі.

Але гэткі "сімфанізм мыслення" звычайна распрацоўваецца разам з рэжысёрам. Маладая Алена Ганум яго пакуль не набыла. Мяркуючы па гэтай і яе ранейшых пастаноўчых працах ("Шабаны", "Зямля Эльзы"), яна добра і даступна "пераказвае" гісторыі, больш разлічвае на яркую візуальную вобразнасць, чым на размаітыя філасофскія асэнсаванні. Магчыма, з-за гэтага спектакль так і не выходзіць на шырокую прастору абагульненняў, а мог бы.

Дзве дзеі аказваюцца няроўнымі. Першая пакідае надзею калі не на творчае адкрыццё (бо для гэтага не стае моцнага рэжысёрскага стрыжня), дык на папраўдзе добры мастацкі вынік. Другая дзея гэты спадзеў разбурае. У ёй ёсць надзвычай запамінальныя сцэны, багатыя на алегорыі. Як шляхцічы-здраднікі, якім "кінулі костку" — нават быццам бы добры кумпяк, літаральна "падаюць вантробы". Ці як званы ператвараюцца ў людзей. Але фінальныя "слонікі" (у гэткім абліччы танчаць індусы, якія прывезлі Завальню тытунь) перакрэсліваюць усе здабыткі, ператвараючы відовішча ў капуснік ці ранішнік. Шкада...

Гераіня Крысціны Дробыш на сваю бяду вырасціла Цмока.

Іван Кушнярук і Генадзь Аўсяннікаў пад пільным вокам Чорнага пеўня.

Традыцыі ціснуць і не адпускаюць

Белай Сароцы Аляксандра Казелы скараліся сквапныя шляхцічы.

Ці можа тэатр стаць крыніцай мемаў? Думка дзіўная, аднак пасля прэм'ернага "Шляхціца Завальні, або Беларусі ў фантастычных апавяданнях" Алены Ганум у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Янкі Купалы яна ўжо не падаецца беспадстаўнай. Пра слонікаў у фінале пастаноўкі не шуткуе толькі лянівы. А хацелася б, каб па завяршэнні спектакля глядач рэфлексаваў над больш глыбокімі алюзіямі.

Настасся ПАНКРАТАВА

Чаму так атрымалася? Мяркуючы па нераўнаму дзеянню, па нераўназначным фрагментам спектакля, па змяшчэнні акцэнтаў то на патэтычныя прамовы, то на дэтэктыўны сюжэт, маладому рэжысёру Алене Ганум не атрымалася да канца вызначыцца з галоўнай мэтай, дзеля чаго яна звяртаецца да культавага нацыянальнага твора.

У адным з інтэрв'ю напярэдадні прэм'еры спадарыня Ганум акрэсліла тэмы будучай пастаноўкі: радзіма і пераемнасць пакаленняў. Аднак на перадпаказе гэтыя ключавыя кропкі аказаліся пад тоўстым слоем даволі ілюстратыўнага пераказу падзей. Мяркую, свой уклад у гэта ўнесла інсцэніроўка Сяргея Кавалёва. Патэтычныя маналогі, зацягнутыя дыялогі, стаўка на сюжэтную лінію не давалі магчымасці для занурвання ў падтэкставыя глыбіні твора. Усё ж тэкст Баршчэўскага шырэйшы за збор нацыянальных міфаў.

Пакуль жа атрымалася так, што ў пастаноўцы дамінуе візуальная частка. "Шляхціца Завальню" хочацца менавіта глядзець, бо заварожвае сцэнаграфія Кацярыны Шымановіч і Сергея Ашухі. Фантастычны чарот, у якім блукаюць персанажы, адразу стварае атмасферу містычнасці. Месяц, што разгараецца вокам чорнага пеўня, з першых хвілін зацягвае, бы ў глыбіні таго самага магічнага возера Нешчарда, куды вяртаецца з паўночнай сталіцы Расійскай імперыі пляменнік шляхціца Завальні Ян. Снег, які ад пачатку засыпае прастору пад сафітамі, становіцца надзвычай маляўнічай дэталлю, якая апраўдвае ўсе гэтыя кажухі і валёнкі на сцэне.

Дадайце сюды цудоўную пластыку ад харэографа Вольгі Скварцовай — і вы зразумееце, чаму ў "плюсах" спектакля ўсе крытыкі адзначаюць відовішчнасць. Аднак хацелася б не толькі глядзець, але і мець больш прычын для разваг і паслятэатральных абмеркаванняў. Зараз "Шляхціц Завальня" бліжэй да школьнікаў: можна паглядзець на ўстаўны (і не самы абавязковы) нумар з калядаваннем, зрабіць выгляд, што напужаўся смешнага ваўкалака ці паверыў у бесцялеснасць цёмнага духа, паспяваць-патанчыць у фінале разам з акцёрамі. І ўсё ж спектакль не заяўлены ранішнікам...

Зараз ізноў пойдзе хваля абурэння, маўляў, крытыкі толькі вышукваюць нагоду для абгавору, не разумеюць, колькі было ўкладзена творчых высілкаў у пастаноўку. Паверце, я цудоўна ведаю працэс стварэння спектакля. Назірала яго з дзяцінства, бо вырасла за кулісамі. Бачыла на свае вочы перажыванні, рэпетыцыйныя супярэчнасці і цяжар творчых пошукаў, калі працавала загадчыкам літаратурнай часткі ў сталічным тэатры лялек. Я паважаю імпэт калектыву, і таму яшчэ больш смуткую, што яго патэнцыял не быў выкарыстаны напоўніцу.

Так, усе адзначылі вытанчаную Белую Сароку, якую шыкоўна ўвасобіў Аляксандр Казела. Аднак талент спадара Аляксандра куды большы за такую прыкметную, але невялікую ды ў многім паўтараючую былыя вобразы ролю. Увесь свой магілёўскі багаж прад'явіў сталічным гледачам Іван Трус. Ягоны доктар Шэльмер атрымаўся бадай адзіным сапраўды таямнічым персанажам. Дык ці гэта дасягненне рэжысёра? Ад гэтага акцёра немагчыма было адарваць вачэй, а, напрыклад, бліснуўшы не так даўно ў Аляксандра Янушкевіча ў "Тадж-Махале" Іван Кушнярук згубіўся ў новым матэрыяле. Як і многія іншыя, бо падстаў для стварэння аб'ёмнага вобразу амаль няма.

Можна доўга пералічаць асобныя яскравыя моманты. Вось выстрэльвае фальклорна-гумарны дуэт Агапкі і Карпы (Крысціна і Андрэй Дробышы). Зрывае ў кароткай мізансцэне апладысменты заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Тамара Міронова — яе пакаёўка Мальгрэта становіцца найлепшым увасабленнем народнага духу. Публіка з задавальненнем слухае народнага артыста СССР Генадзя Аўсяннікава, хоць яму, на жаль, амаль і няма чаго тут іграць. Аднак я пералічаю фрагменты. У цэласную карціну яны, як не шкада, не скляліся. Традыцыі мусяць быць штуршком для рэалізацыі актуальнага, а не ператварацца ў чароўны вір, які паглынае ўсялякія спробы выказаць асабістае.

Складваецца ўражанне, што айчынныя рэжысёры існуюць у нейкай ізаляванай прасторы, таму і ходзяць па кругу. Дапускаю, не ўсе могуць даехаць у замежжа. Але ёсць жа міжнародны фестываль "ТЭАРТ", які заманьвае ў Мінск выбітныя калектывы. У кінатэатрах у рамках праекта TheatreHD ладзяцца трансляцыі лепшых пастановак сусветных сцэн. А можна проста прыйсці на спектакль да калег, што зараз знаходзяцца на піку творчасці (Аляксандр Янушкевіч, Яўген Карняг, Вольга Лабоўкіна, Ігар Казакоў — спіс можна працягваць) і паспрачацца з імі ў варыяцыях раскрыцця задуманага. Часам менавіта ўнутранае спаборніцтва дапамагае нам перастаць таптацца на месцы.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ


Купалаўскі цмок ля містычнага возера Нешчарда.

Ён харошы. У агульным і цэлым

Студэнцкая пара Мішы (Арцём Курэнь), Сірожы (Максім Брагінец) і Дзіны (Ганна Семяняка).

Часам спектакль збіраецца, бы бранзалет: замовяць бусіны з музыкі, п'есы, сцэнаграфіі, рэжысуры ды размесцяць побач. Ланцужок на першы погляд прывабны, толькі замест сінтэтычнага палатна атрымліваюцца эфектныя паасобку, аднак не з'яднаныя агульнай ідэяй лапікі. А да чаго падобны прэм'ерны "Сірожа" ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі? Аднайменную п'есу Юліі Чарняўскай паставіў мастацкі кіраўнік РТБД Аляксандр Гарцуеў.

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

У юнацтве мяне надзвычай натхняла гісторыя стварэння спектакляў у знакамітым "Ленкоме". Рэжысёр Марк Захараў разам з драматургам Рыгорам Горыным у працэсе рэпетыцый дапрацоўвалі п'есу, адточвалі дыялогі, паглыблялі характары персанажаў, часам змянялі ключавыя сцэны. Мяркую, такая работа на жывую аднімала ў абодвух творцаў шмат высілкаў і нерваў, аднак у выніку яны стварылі надзвычай трапнае, вострае і актуальнае сцэнічнае выказванне.

Зараз для такога руплівага падыходу не ва ўсіх творцаў хапае часу, а можа і жадання. Вось і прэм'ерны спектакль Аляксандра Гарцуева "Сірожа" пакінуў менавіта адчуванне раз'яднанасці.

Былы Сірожа "дарос" да Сяргея (Андрэй Дабравольскі).

Сцэнограф Юрый Саламонаў відавочна кіраваўся заяўленым жанрам "жыццё ў дзвюх эпохах". Спачатку на сцэне — пакой студэнцкага інтэрната ўзору 1980 года: жалезныя ложкі з прагнутай сеткай, тынкоўка, што настальгічна абсыпаецца на самых відавочных месцах, драўляная шыба, за якую першакурснік-філолаг Сірожа будзе вывешваць авоську з прадуктамі. Спадар Саламонаў педантычна аднаўляе тагачасныя дэталі інтэр'ера: літаграфію з партрэтам Сяргея Ясеніна, якую вешалі літаральна ва ўсіх кватэрах, плакат рок-гурта Deep Purple — яго павінен быў ведаць кожны паважаючы сябе прагрэсіўны студэнт — і абавязкова дыванок з аленем, што прывозіць з сабой з вёскі галоўны герой. Для другога акта, у якім дзеянне адбываецца ў 2012-м годзе, мастак пакінуў толькі авансцэну, схаваўшы інтэрнат за сеткаватай заслонай. Тут мастацкае вырашэнне абмяжоўваецца некалькімі лавачкамі, штучным паласам-травой і мангалам з надзвычай рэалістычным шашлыком.

У п'есе Юліі Чарняўскай няма такой засяроджанасці на скрупулёзным аднаўленні прасторы вакол герояў. Яна спыняецца толькі на некаторых дэталях, як, напрыклад, партрэт Уладзіміра Высоцкага, каб заглыбіць характарыстыку сваіх персанажаў і патлумачыць матывы іх учынкаў. Праз яскравыя дыялогі яна раскрывае лёсы пяцярых студэнтаў, кожны з якіх імкнуўся да сваіх вяршынь.

Міша (Сяргей Шымко) і Дзіна (Вераніка Буслаева) змаглі пагаварыць пра асабістае праз 32 гады.

Міша (Арцём Курэнь) быў геніем у матэматыцы, Дзіна (Ганна Семяняка) праз заканахнасць марыла пра сямейнае шчасце, Гена (Максім Шышко) імкнуўся да вольнага жыцця ў краіне з адкрытымі межамі, Максім (Аляксандр Ніканенка) проста лёгка крочыў па жыцці. Засяліўшыся да іх, вясковы хлопец Сірожа (Максім Брагінец) зайздросціць іх уменням, мэтам і памкненням. Ён сам, здаецца, неблагі чалавек ды генетычна закладзенай гаспадарлівасцю можа ў нечым і дапамагчы іншым. Вось толькі яго асобу разбурае нянавісць... да сябе самога. Праз 32 гады ён прызнаецца, што ў студэнцкія часы бачыў сябе калгаснікам, дэбілам. Адчуваў, што і апрануты не так, і чытае не тое, і гаворыць непісьменна: "Навошта я сам сабе такі, Божухна?" Хтосьці праз разуменне сваёй недасканаласці пачынае шлях да самаўдасканалення. Іншы ж бачыць магчымасць узняцца толькі праз прыніжэнне блізкага. Вось і Сірожа пачаў з анёльскім выразам твару паскудзіць суседзям.

Спадар Гарцуеў з псіхалагічнымі тонкасцямі ў характарах персанажаў абыходзіцца па-свойму: усе карціны першага акта ён перамяжае кінахронікай. Пад савецкія песенныя хіты ў перамешку з арыгінальнай музыкай кампазітара Дзмітрыя Фрыгі на панарамным экране транслююцца віды савецкага Мінска, сустрэчы з Машэравым, афганскія хронікі. Спектакль увогуле пачынаецца з зацягнутай нарэзкі з творчасці і пахавання Уладзіміра Высоцкага, што адразу змяняе сэнсавыя акцэнты пастаноўкі: глядач настройваецца не на даследаванне чалавечай прыроды, а на настальгію па далёкім мінулым.

З-за відэапаштовак першае дзеянне падалося бясконцым. І гэта пры тым, што ў спектаклі задзейнічаны амаль увесь зорны склад РТБД! Складаную псіхалагічную гульню Ганны Семянякі, Арцёма Курэня і Максіма Брагінца раз за разам перарываў залішні відэашэраг. Здавалася, выправіць справу з тэмпарытмам павінны былі выдатныя гумарыстычныя сцэны з Валянцінам Салаўёвым, Аленай Баяравай і Віктарам Багушэвічам. Аднак замест таго, каб стаць пікантнай прыправай, яны раптам пачалі замяняць асноўнае блюда. Ад таго ідэя драматурга ўсё больш патанала ў другасных дэталях.

У другой дзеі рэжысёр нарэшце адмовіўся ад відэаперабівак. Дзеянне пайшло шпарчэй, дэманструючы прорву подласці і пошласці, у якой праз 32 гады апынуўся Сірожа. У драматурга ўсё танчэй: так, былы лузер сёння на кар'ернай вяршыні, вось толькі маральнага задавальнення яму гэта не прынесла. Ён паклаў усе сілы, каб даказаць сваю важкасць, а па сутнасці застаўся адбіткам чужых эмоцый: мог павольна дыхаць толькі тады, калі сябры ім зачароўваліся ці яму зайздросцілі. Дзеля сваіх прынцыпаў ён закапаў усе свае добрыя якасці. Ды толькі ўчыненае зло не знікае бясследна.

Прываблівае, што ў спадарыні Чарняўскай няма падзелу на белых і чорных. Вось на камсамольскім зборы пасля ад'езду Мішы ў Ізраіль Сірожа назваў суседа здраднікам, а Максім і Генка слова не сказалі. Праўда, разам з усімі паднялі рукі за выключэнне сябра... Ды і яе Сірожа, у адрозненне ад рэжысёрскага вырашэння, не з'яўляецца адно гадам. Драматург не апраўдвае хлопца, аднак дае падставу для разумення яго ўчынкаў і праз Дзіну даруе яму. Бо, толькі пабачыўшы дабро ў чалавеку, мы можам дапамагчы яму паверыць у свае высакародныя якасці.

Рэжысёрскі фінал канчаткова змяшаў усе карты. На фоне песні "До свидания, наш ласковый Миша" замільгацела кінахроніка закрыцця Алімпійскіх гульняў, дакументальныя кадры ўзарванага рэактара Чарнобыльскай АЭС, мітынгаў на плошчах паміраючага Савецкага Саюза, выступлення Ельцына і стральбы з танкаў па Белым доме ў Маскве. Незразумела, навошта спатрэбіўся менавіта такі відэашэраг, бо ў драматурга відавочна не было мэты стварыць партрэт пакалення на фоне эпохі. Ды і Сірожу на шлях самаразбурэння падштурхнуў зусім не вэрхал на стыку эпох. У анатацыі да спектакля спадарыня Чарняўская піша: "Сірожа" — гэта гісторыя пра юнацтва маіх аднагодкаў — і пра іх сталасць. Пра ганенне і помсту. Пра тое, як учынкі людзей, зробленыя ў маладосці па дурасці, непрыкметна становяцца ніцямі лёсу, а дробязі ткуць непапраўнасць будучыні". Здаецца, перад намі той прыклад, калі можна больш уважліва прыслухацца да драматурга.

КУЛЬТУРА
WWW.KIMPRESS.BY
№ 28 / 13 ЛІПЕНЯ 2019 г.

З мэтай развіцця нацыянальнай культуры, прапаганды яе здабыткаў, збору і распаўсюджвання фальклорна-этнаграфічнай спадчыны штогод сярод публічных бібліятэк краіны праводзіцца рэспубліканскі конкурс "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" — выдатная магчымасць выявіць лепшыя ў сваёй справе бібліятэкі, стымуляваць астатніх яго ўдзельнікаў імкнуцца да вяршынь бібліятэчнага майстэрства. Агалосім вынікі гэтага года.

Захапілі, здзівілі,

Звычайна конкурс праводзіцца ў два этапы (абласны і рэспубліканскі) па чатырох намінацыях: "За пошукавую і даследчую працу", "За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем", "За падтрымку і развіццё чытання", "За навацыі ў сферы бібліятэчнай справы". Спачатку пераможцаў вызначылі па абласцях, і толькі пасля конкурсныя работы ацаніла прафесійнае журы. У яго склад увайшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных бібліятэк, цэнтралізаваных сістэм публічных і дзіцячых бібліятэк горада Мінска, грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд культуры".

Сёлета ў конкурсе прынялі ўдзел 38 публічных бібліятэк: 14 цэнтральных і 24 бібліятэкі-філіяла, 15 гарпасялковых і сельскіх. Члены журы адзначылі цікавае і крэатыўнае, поўнае і паслядоўнае раскрыццё заяўленых тэм удзельнікамі конкурсу. Амаль кожная работа змяшчала ўласныя распрацоўкі, рэкламную і інфармацыйную прадукцыю; суправаджалася электроннымі прэзентацыямі, відэаматэрыяламі, гульнёвымі праграмамі, сцэнарыямі і гэтак далей.

23 бібліятэкі-пераможцы і сем бібліятэк, прадстаўленых журы да заахвочвання, атрымаюць узнагароды адпаведна з загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 109 ад 6 чэрвеня 2019 г. "Аб выніках XXVII рэспубліканскага конкурсу "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" — дыпломы першай, другой, трэцяй ступені і грашовыя прэміі ў памерах 50, 40 і 30 базавых велічынь адпаведна. Бібліятэкі, прадстаўленыя да заахвочвання, атрымаюць грашовыя прэміі ў памеры дзесяці базавых велічынь.

Распавядзём падрабязней пра дасягненні бібліятэк, якія занялі прызавыя месцы ў кожнай з намінацый.

Найбольшая колькасць работ была прадстаўлена "За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем" і "За пошукавую і даследчую працу" — па 11 у кожнай.

У намінацыі **"За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем"** найлепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк стала *Цэнтральная раённая бібліятэка імя Аляксандра Пушкіна Мазырскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Гомельскай вобласці.* Асаблівую ўвагу яна надае гістарычнаму, літаратурнаму і эстэтычнаму кірункам краязнаўчай дзейнасці, па кожным з якіх праводзіцца сістэмная праца. Так, бібліятэка паспяхова рэалізуе інтэрнэт-праект "Ні дня без думкі аб родным краі", краязнаўчы праект "Мастацкая галерэя "Зачараваныя родным краем". Атрымаць дадатковыя веды аб літаратуры, гісторыі, культуры і мастацтве роднага краю дапамагае дзецям і падлеткам краязнаўчая гасцёўня "Сустрэча".

Першае месца сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі прысуджана *Бяляеўскай сельскай бібліятэцы-клубу Чачэрскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Гомельскай вобласці* за нацыянальнае адраджэнне, выхаванне любові і павагі да роднага краю, цікавасці да вывучэння гісторыі сваёй вёскі. У ёй арганізавана аматарскае аб'яднанне "Радзімічы", члены якога вывучаюць традыцыі і звычаі роднай вёскі, шукаюць інфармацыю, даследуюць зніклыя вёскі, крыніцы, курганы, вадаёмы. Створаны міні-музей "Скарбы сялянскай хаты", дзе знаходзяцца экспанаты сельскага побыту і вырабы мясцовых майстроў, друкаваныя выданні ўспамінаў старажылаў, дакументаў, фотаздымкі. Бібліятэкар працуе з дзецьмі і па экалагічным краязнаўстве, грамадзянска-патрыятычным выхаванні.

Другую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала *Дзіцячая бібліятэка-філіял бібліятэчнай сеткі Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці* за далучэнне да чытання, прапаганду каштоўнасці чытання і кнігі, стымуляванне цікавасці да сусветнай літаратурнай спадчыны. Ёй рэалізаваны праекты "Кніжны санаторый — 2018", "Чудесный рюкзачок", скіраваныя на арганізацыю летняга вольнага часу праз гульню і кнігу. Фарміраванню ўстойлівай цікавасці да гісторыі малой радзімы спрыяе гісторыка-краязнаўчая праграма "Наш край, як рай" (2018 — 2020). У бібліятэцы ёсць каворкінг-зона з мяккай мэбляй яркай расфарбоўкі, настольнымі гульнямі, дзіцячымі часопісамі і кніжкамі-малышкамі; месца для работы, абсталяванае неабходнай камп'ютарнай тэхнікай, свабодным доступам да высокахуткаснага інтэрнэту; дзейнічаюць клуб займальнага чытання "Книгочей" і экалагічны клуб "Журавушка".

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк другое месца заняла *Сакольніцкая сельская бібліятэка бібліятэчнай сеткі Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці.* У рамках краязнаўчага патрыятычнага праекта "Нам ёсць чым ганарыцца, нам ёсць каго памятаць" сабраны ўнікальныя матэрыялы аб гістарычным мінулым вёскі, знакамітых земляках і воінах, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. На базе бібліятэкі створаны Пакой мужнасці і славы, дзе адлюстравана ваенная гісторыя вёскі Сакольнічы, экспануюцца матэрыялы аб героях-земляках. З мэтай фарміравання ў падрастаючага пакалення любові да сваёй малой радзімы, беларускай мовы і кнігі дзейнічае этнаграфічны куток "Я вырас тут, і край мне гэты любы". Функцыянуе экалагічны клуб "Лесавічок".

Дыпломам трэцяй ступені ў намінацыі "За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем" узнагароджана *Мар'інагорская гарадская бібліятэка сеткі публічных бібліятэк Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці* за комплексную, скаардынаваную сістэму дзеянняў па патрыятычным выхаванні дзяцей і падлеткаў. Яна ажыццяўляе праект "Кнігакампанія "Сымон і К@" у падтрымку беларускай кнігі і чытання, у межах якога юныя артысты бібліятэчнага тэатра "Усмешка" рыхтуюць тэатралізаваныя прадстаўленні па творчасці беларускіх пісьменнікаў. Асаблівую ролю ў азнаямленні дзяцей і падлеткаў з гісторыяй і прыродай роднага краю адыгрывае міні-музей "Нам засталася спадчына". Пры бібліятэцы працуе летні клуб "Том і Джэры", адным з кірункаў якога з'яўляецца работа па прапагандзе краязнаўчай літаратуры.

Сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк трэцяе месца ў гэтай намінацыі заняла *Мельніцкая сельская бібліятэка Маларыцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці.* Традыцыйна работа бібліятэкі вядзецца па некалькіх кірунках, але асаблівая ўвага — на патрыятычнае выхаванне і духоўную асвету падрастаючага пакалення. Для гэтага створаны электронны гісторыка-краязнаўчы рэсурс "Малая радзіма: краязнаўчы маршрут па вёсцы Мельнікі", у якім сістэматызавана інфармацыя аб Вялікай Айчыннай вайне, па гісторыі калгаса і школы, сабраны матэрыял пра знакамітых людзей вёскі. Штогод у бібліятэцы праводзяцца летнія чытанні, розныя акцыі, конкурсы, святы. Так, у рамках свята кнігі "Па казачных сцяжынках" каля школы была арганізавана вулічная чытальная зала "Бібліядворык". Сярод летніх чытацкіх праектаў варта прыгадаць "Наша фішка: лета+кніжка", "ЛетоЧтение с развлечением".

У намінацыю **"За пошукавую і даследчую працу"** на разгляд журы, як і ў папярэднюю намінацыю, было прадстаўлена 11 работ.

Найлепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана *Цэнтральная раённая бібліятэка Шаркаўшчынскай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Віцебскай вобласці.* Да 130-годдзя з дня нараджэння Язэпа Драздовіча супрацоўнікамі раённай бібліятэкі праведзена значная пошукава-даследчая работа па творчай спадчыне славутага земляка — жывапісца, графіка, этнографа, фалькларыста, пісьменніка Язэпа Драздовіча. Супрацоўнікі бібліятэкі вывучалі матэрыялы з фондаў Цэнтральнай раённай бібліятэкі, Мастацка-этнаграфічнага музея імя Язэпа Драздовіча, уласныя архівы мясцовых жыхароў, аўтарытэтныя матэрыялы з інтэрнэт-крыніц і ўспаміны сведкаў. Вынікам гэтай карпатлівай працы сталі бібліяграфічны дапаможнік "Вандроўнік. Доўгае вяртанне" і зборнік матэрыялаў "Адсюль твой пачатак і тут твой працяг", якія карыстаюцца даволі значным попытам у чытачоў бібліятэкі і ўсіх тых, хто цікавіцца беларускай культурай.

Першай прэміяй сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, журы адзначыла *Заходскую сельскую бібліятэку Цэнтралізаванай бібліятэчнай сеткі Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці.* Там праводзіцца вялікая даследчая праца па выяўленні дакументных крыніц, што ўтрымліваюць звесткі аб вёсцы Еўдакімавічы і яе жыхарах. Наладжана творчае супрацоўніцтва са Шклоўскай цэнтральнай раённай бібліятэкай, Шклоўскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеем, Дзяржаўным архівам Магілёўскай вобласці, Магілёўскай абласной бібліятэкай імя Уладзіміра Леніна, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. На падставе сабранага матэрыялу створаны электронны краязнаўчы рэсурс "Ад вытокаў да аграгарадка", у якім адлюстравана гісторыя аграгарадка Еўдакімавічы ад старажытных часоў да нашых дзён. Галоўнае дасягненне шматгадовай пошукавай і даследчай дзейнасці бібліятэкара — адкрыццё этнаграфічнага музея "Беларуская хатка", які вобразна прадстаўляе жыццё і побыт, культуру і традыцыі жыхароў вёскі.

Другое месца ў гэтай намінацыі прысуджана *Ляхавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэме Брэсцкай вобласці* за плённую пошукавую і даследчую працу аб вывучэнні, сістэматызацыі і захаванні этнаграфічных, тапанімічных, фальклорных матэрыялаў аб Ляхавіцкім раёне. На працягу апошніх гадоў супрацоўнікамі бібліятэкі вядзецца праца па стварэнні баз даных сеткі бібліятэк Гомельскай вобласці. Аднаўленне і захаванне памяці аб сваёй малой радзіме бібліятэкар увасобіла ў "Летапісе вёскі Броннае", створанага на падставе ўспамінаў жыхароў вёскі і звестак, атрыманых з краязнаўчых кніг аб Рэчыцкім раёне. У рамках праекта "Стужка часу" ў бібліятэцы афармлены фальклорна-этнаграфічны пакой. Тут сабраны каштоўны матэрыял па гісторыі і культуры вёсак сельскага Савета: прылады сялянскага побыту, рукатворныя вырабы мясцовых майстроў, багатая калекцыя вышыванак, сурвэтак, дамацканыя посцілкі, вязаныя рэчы, сялянскае адзенне. На паглыбленне ведаў аб беларускіх і мясцовых абрадах, зберажэнне і захаванне знікаючых народных рамёстваў скіраваны праект "Ручнік — дарога чысціні". Калекцыя бібліятэкі налічвае звыш 20 ільняных ручнікоў паўсядзённага, абрадавага і дэкаратыўнага прызначэння.

На трэцяе месца сярод гарадскіх і раённых бібліятэк намініравана *Астравецкая раённая бібліятэка Гродзенскай вобласці.* Вядучы кірунак яе дзейнасці — краязнаўчы. Бібліятэка арганізуе экспедыцыі, падчас якіх занатоўваюцца ўспаміны старажылаў вёсак, запісваюцца відэаматэрыялы мясцовага фальклору, ствараюцца ві-

перамаглі

дэапрэзентацыі і слайдшоу, якія затым выкарыстоўваюцца ў правядзенні сацыякультурных мерапрыемстваў. Супрацоўнікі Астравецкай раённай бібліятэкі за 2016 — 2018 гады здзейснілі сем краязнаўчых экспедыцый. У межах Года малой радзімы і ў сувязі з 550-годдзем Астраўца была створана самаробная кніга "Астравеччына ў легендах". Выданне сістэматычна экспануецца на кніжных выставах і выязных мерапрыемствах з мэтай папулярызацыі краязнаўчых ведаў аб краі.

Дыпломам трэцяй ступені ў намінацыі "За пошукавую і даследчую працу" адзначана *Стрыгінская сельская бібліятэка Бярозаўскай раённай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці* за высокі ўзровень пошукавай краязнаўчай дзейнасці, вывучэнне, захаванне і папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны Бярозаўшчыны. Вынікам пошукавай дзейнасці бібліятэкара стала стварэнне краязнаўча-асветніцкага цэнтра "Ведаць. Паважаць. Ганарыцца". У цэнтры арганізаваны Куток памяці, прысвечаны землякам-удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Куток уяўляе з сябе своеасаблівы міні-музей, які ўтрымлівае сямейныя рэліквіі ветэранаў, удзельнікаў баявых дзеянняў і родных франтавікоў, шматлікія з якіх — у арыгінале: звыш 200 фотаздымкаў ваенных часоў, узнагародныя лісты, ордэны і медалі, чырвонаармейскія кніжкі, пасведчанні да медалёў, франтавыя лісты-трохвугольнікі, пісьмовыя ўспаміны і іншае.

У намінацыю **"За падтрымку і развіццё чытання"** было прадстаўлена дзевяць работ.

Найлепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана *Бярэзінская дзіцячая бібліятэка Бярэзінскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Мінскай вобласці* за рэалізацыю літаратурна-асветніцкага праекта "Расцём разам з кнігай". Яго галоўнай мэтай з'яўляецца фарміраванне ўстойлівай цікавасці старэйшых дашкольнікаў і малодшых школьнікаў да мастацкай літаратуры праз стварэнне адзінай сістэмы працы педагогаў, супрацоўнікаў бібліятэкі і сям'і. Праект прадугледжвае штомесячнае правядзенне эксклюзіўных акцый і мерапрыемстваў літаратурна-пазнавальнага характару ў творчай садружнасці з адукацыйнымі ўстановамі горада. Пры правядзенні мерапрыемстваў ужываюцца нестандартныя формы, насычаныя выяўленчымі інавацыйна-мастацкімі і прапагандысцка-рэкламнымі прыёмамі: бібліягастролі ў дзіцячым садку, міні-тэатр казкі, бібліятэка пад адкрытым небам, літаратурны калейдаскоп, кніжны караван, літаратурны цягнічок, чытай-скверык, выязная чытальная зала, Дні рэкламы кнігі, прома-акцыі, дзень дашкольніка, флэшбук, экскурсіі ў бібліятэку і гэтак далей.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, на першым месцы — *Баранавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Яна Чачота Баранавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці*. Там праводзяць вялікую работу па ўшанаванні памяці нацыянальнага паэта, фалькларыста, мовазнаўцы, этнографа, публіцыста, грамадскага дзеяча Яна Чачота. Рэалізаваны праект "Наталенне Радзімай", мэта якога — прысваенне Баранавіцкай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Яна Чачота і збор матэрыялаў пра жыццё і дзейнасць земляка. У 2018 годзе быў распрацаваны і рэалізаваны праект "Ян Чачот. NoN STOP", скіраваны на стварэнне ўласнай прадукцыі пра пісьменніка з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Так, былі створаны закладкі з QR-кодам, пальчыкавыя гульні "Мышанка", "Замак", "Тэатр на стале" для дзіцячага чытача, буктрэйлер "Мышанка", прэзентацыя ў фармаце 3D кнігі "Ян Чачот", аднайменная база даных і гэтак далей.

Другую прэмію сярод гарадскіх і раённых бібліятэк атрымала *Цэнтральная бібліятэка цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці* за папулярызацыю літаратуры і актывізацыю інтарэсу да кнігі праз рэалізацыю шэрагу праектаў. Так, краязнаўчая эстафета "Беларускае! Роднае! Сваё!" скіравана на далучэнне шырокага кола чытачоў да нацыянальнай культуры і літаратуры. Адраджэнню традыцый сямейнага чытання прысвечаны праект "Сям'ю яднае мудрасць кніг". Крэатыў-праект "Библиотека вне стен" прадугледжвае набліжэнне бібліятэчных паслуг да карыстальнікаў, правядзенне мерапрыемстваў і акцый па-за сценамі бібліятэкі. Адметны праект бібліятэкі па папулярызацыі кнігі і чытання — "Свабодная вулічная бібліятэка" (маленькая бібліятэка пад адкрытым небам).

Найлепшай сярод гарпасялковых і сельскіх бібліятэк у гэтай намінацыі стала *Раклевіцкая сельская бібліятэка — цэнтр традыцыйнай культуры Дзятлаўскай раённай бібліятэкі Гродзенскай вобласці*. Установа развівае цікавасць да чытання праз выкарыстанне розных форм папулярызацыі кнігі, навучанне дзяцей шанаванню спадчыны, любові да роднага краю, яго гісторыі і культуры. Асаблівая ўвага надаецца прапагандзе беларускай літаратуры, культуры, творчасці беларускіх пісьменнікаў. Трэці год запар бібліятэка працуе па мэтавай праграме "Жывуць традыцыі — квітнее зямля", мэта якой — вывучэнне гісторыі, культуры свайго краю, выхаванне павагі і любові да бацькоўскай зямлі. У межах праекта "ЛетаЧытанне", скіраванага на арганізацыю летняга адпачынку дзяцей і падлеткаў, былі здзейснены разнастайныя акцыі і мерапрыемствы. Штогод бібліятэкар праводзіць акцыю "Расці з кнігай" сумесна з вучэбна-педагагічным комплексам "Раклевіцкі дзіцячы сад-базавая школа".

Дыплом трэцяй ступені сярод гарадскіх і раённых бібліятэк у намінацыі "За падтрымку і развіццё чытання" атрымала *Гуёўская дзіцячая бібліятэка-філіял Гуёўскай раённай бібліятэкі Гродзенскай вобласці* за рэалізацыю цікавых, арыгінальных праектаў па прапагандзе кнігі і чытання сярод дзяцей і падлеткаў, фарміраванне культуры чытання падрастаючага пакалення. Так, лепшаму засваенню роднай мовы, выхаванню нацыянальнай свядомасці садзейнічае праект "Беларускі чацвер". У рамках "Гучных чытанняў" праходзяць мерапрыемствы па прапагандзе твораў беларускай і сусветнай літаратуры. Далучэнне падрастаючага пакалення да чытання сродкамі тэатральнага мастацтва, эстэтычнае выхаванне малодшых школьнікаў, фарміраванне творчай асобы дзіцяці ўвасобілася ў праекце "Тэатр у кнізе". Шмат выстаў арганізавана ў рамках праектаў "Через осязание к книге" і "Зазірнуць у мінулае".

У намінацыю **"За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы"** на разгляд журы трапіла сем работ.

Найлепшай сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прызнана *Салігорская раённая цэнтральная бібліятэка Мінскай вобласці*. Сярод навацый бібліятэкі — краязнаўчая квэст-гульня "#Откройсвойгород", віртуальны тапанімічны маршрут "ВО!Круг Солигорска", online-віктарына "Любопытный Солигорск". Новыя формы работы з чытачамі распрацаваны ў межах інфармацыйна-адукацыйнага краязнаўчага праекта "Культурный код Солигорска" (2016 — 2019), асноўная мэта якога — распаўсюджванне краязнаўчых ведаў сярод жыхароў і гасцей Салігоршчыны ў зручнай і сучаснай форме. Праект прадугледжвае правядзенне віктарын, конкурсаў, камандных тураў і індывідуальных перамог, квэстаў і экскурсій. У выніку выкарыстання новых форм работы павысілася якасць абслугоўвання карыстальнікаў, бібліятэкары прыцягнулі ўвагу гараджан да сваёй дзейнасці і паказалі, што з бібліятэкай цікава.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці, дыпломам першай ступені адзначана *Сельская бібліятэка аграгарадка Мураваная Ашмянка Ашмянскай раённай бібліятэкі Гродзенскай вобласці*. Сярод навацый установы — праект "Стварэнне клуба старастаў вёсак "КУТ" (Культура ўпраўлення тэрыторый), які фінансаваўся Еўрасаюзам у рамках праграмы міжнароднай гуманітарнай дапамогі (2017). Галоўная задача — арганізацыя інфармацыйна-культурнага абслугоўвання насельніцтва, наладжванне валанцёрскага руху, актывізацыя сацыяльных магчымасцяў сельскай бібліятэкі. У большасці члены клуба — старасты вёсак — людзі пенсійнага ўзросту, якія дапамагаюць у арганізацыі бібліятэчнага абслугоўвання жыхароў сваіх вёсак, актывізуюць мясцовае насельніцтва. Для рэалізацыі праекта пры сельскай бібліятэцы ў Мураванай Ашмянцы створаны сацыяльна-інфармацыйны цэнтр, краязнаўчы музейны пакой, працуе валанцёрская група.

Другая прэмія сярод гарадскіх і раённых бібліятэк прысуджана *Бібліятэцы-філіялу № 3 Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы горада Гродна*, што з'яўляецца адметнасцю горада і рэспублікі. Гэта казачнае памяшканне, дзе жывуць па суседству з кнігамі лялькі, мастацкія вырабы ў розных стылях, працуе музейны пакой "Лялечны дом" і клуб "Гродзенская лялька". Іх калекцыя ўражвае: народныя лялькі, абярэгі, героі казак і савецкіх мультфільмаў, замежных мультсерыялаў. Лялькі зроблены з палімернай гліны, воўны, тэкстылю, саломы і іншых матэрыялаў. Клуб "Гродзенская лялька" быў утвораны ў 2014 годзе і налічваў больш за 40 жанчын, якія займаліся вырабам лялек і ўпрыгожанняў з прыродных матэрыялаў, вучыліся тэхніцы пляцення, сухога валяння, дэкупажу, скрапбукінгу і іншым уменням. Майстрыхамі клуба створана агулам каля 300 лялек.

Дыпломам другой ступені ў гэтай намінацыі адзначана *Маслакоўская сельская аб'яднаная бібліятэка Горацкай раённай бібліятэчнай сеткі Магілёўскай вобласці* за збор, захаванне, апрацоўку і папулярызацыю краязнаўчых матэрыялаў. Так, у краязнаўчым кутку бібліятэкі "Край, адкуль мы родам" прадстаўлены матэрыялы аб сацыяльных установах вёскі Маслакі, перадавіках сельскай гаспадаркі, героях Вялікай Айчыннай вайны. На падставе сабранага бібліятэкарам унікальнага матэрыялу, які ўключае ўспаміны відавочцаў пра перыяд Вялікай Айчыннай вайны, публікацый з прэсы, мемуарнай літаратуры, бібліяграфічных дадзеных складзены даведачна-інфармацыйнае выданне "Глазами тех, кто был в бою" і зборнік "Памятные места". Бібліятэкар разам з юнымі чытачамі наведваюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, сем'і загінуўшых воінаў, дзяцей вайны, дастаўляюць ім кнігі і перыядычныя выданні, віншуюць са святамі, аказваюць пасільную дапамогу.

Трэцяе месца ў намінацыі "За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы" заняла *Ганцавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка імя Васіля Пракурава Ганцавіцкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Брэсцкай вобласці* за крэатыўны і наватарскі падыход да рэалізацыі творчых праектаў, арганізацыю раённага конкурсу прафесійнага майстэрства па стварэнні лепшага бібліятрансфармера "Новае ў бібліятэцы". На конкурс "Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры" ўстановаі былі прадстаўлены бібліятрансфармеры па творчасці вядомага пісьменніка Анатоля Бутэвіча (Раённая дзіцячая бібліятэка), аб жыцці і творчасці лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч (Ганцавіцкая сельская бібліятэка), па творчасці Дануты Бічэль-Загнетавай (Агарэвіцкая сельская бібліятэка). Творчыя работы ўяўляюць тэматычныя дасье, напоўненыя сцэнарнымі матэрыяламі, рэкламнымі выданнямі, фотаздымкамі, мультымедыйнымі дыскамі.

Сярод бібліятэк, якія размешчаны ў сельскай мясцовасці на трэцяе месца журы вылучыла *Ракаўскую сельскую бібліятэку Валожынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Мінскай вобласці*. Установай распрацаваны краязнаўчы турыстычны маршрут "Ракаўскі шлях" з мэтай прыцягнення ўвагі да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй малой радзімы, памятных месцаў Ракаўшчыны, рэкламна-інфармацыйнага забеспячэння турыстычнага патэнцыялу Валожынскага раёна. Турыстычны маршрут праходзіць па асноўных славутасцях Ракава і ўключае 15 турыстычных месцаў для наведвання экскурсантамі. З 2003 года бібліятэка працуе па мэтавай праграме "Вяртанне да вытокаў", якая рэалізуецца і сёння. Праграма прадугледжвае пошук, збор, захаванне і прапаганду матэрыялаў, якія даюць дасканалае і шматпланавае асвятленне падзей і фактаў па гісторыі і культуры Ракаўшчыны. У рамках рэалізацыі праграмы ў бібліятэцы створаны краязнаўчы куток "Жыву і дыхаю, мой край, табой". З 1998 года дзейнічае краязнаўчы клуб "Сузор'е".

■■■

Якасны вынік праведзенага конкурсу — гэта пацвярджэнне выключнасці і індывідуальнасці кожнай бібліятэкі, высокага прафесійнага і творчага майстэрства бібліятэчных спецыялістаў нашай краіны. Яго ўдзельнікі зноў здзівілі, захапілі і зацікавілі членаў журы, падзяліліся сваімі перспектыўнымі напрацоўкамі і набылі каштоўны прафесійны вопыт, які спатрэбіцца ў рабоце і пры падрыхтоўцы матэрыялаў да наступнага XXVIII рэспубліканскага конкурсу.

Вольга КАКШЫНСКАЯ,
галоўны бібліятэкар
Нацыянальнай бібліятэкі
Беларусі

Святочныя дзеі
пад знакам Незалежнасці

На мінулым тыдні Беларусь святкавала Дзень Незалежнасці, з нагоды чаго многія ўстановы культуры зладзілі маштабныя святочныя мерапрыемствы — прычым, як у сваіх сценах, так і ў фармаце open-air. Зразумела, менавіта пра гэта згадваюць у сваіх лістах нашы карэспандэнты з розных куткоў краіны. А таксама, натуральна, і пра некаторыя іншыя адметныя мерапрыемствы, што адбыліся днямі ў Беларусі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

На здымках:
1 Бібліятэкары Браслава на выставе ў фармаце open-air.
2 Кветкі і вянкі да помніка загінулым жыхарам в. Шавулічы.
3 Партрэтная галерэя ў Казлоўцы цікавіла многіх.
4 Хвіліна маўчання ў памяць герояў у Гальшанах.

РЭКВІЕМ І ПАМЯЦЬ

Штогод у мемарыяльным комплексе "Шавулічы", што ў **Ваўкавыскім раёне** Гродзенскай вобласці, на месцы спаленай разам з 366 жыхарамі беларускай вёскі, праходзіць мітынг-рэквіем, прысвечаны памяці ахвяр фашызму. Не стаў выключэннем і гэты год. Як пішуць нам супрацоўнікі Ваўкавыскага РМЦ, днямі тут, у вёсцы-помніку, прайшла тэатралізаваная рэканструкцыя падзей таго жахлівага дня — 7 ліпеня 1943 года. А пазней сваякі загінулых, а таксама людзі, якія прыйшлі на мітынг, усклалі кветкі і вянкі каля помніка жыхарам Шавуліч.

У **Ашмянскім раёне**, як піша нам супрацоўнік аддзела метадычнай работы Ашмянскага РЦК Кацярына Рудзік, гэтымі днямі ладзіліся святочныя мерапрыемствы з нагоды Дня Незалежнасці і 75-годдзя вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Напрыклад, у аграгарадку Гальшаны адбыўся святочны канцэрт "Беларусь — гэта імя Перамог!"

На помніку, што стаіць у паселішчы, як напамін пра тыя далёкія часы, высечаны прозвішчы 28 воінаў. Сярод іх імёны Аляксандра Аўдзеева і Пятра Страленкі — членаў экіпажа 43-га авіяпалка, якія скіравалі свой самалёт у калону нямецкіх танкаў. Памяць герояў была ўшанавана хвілінай маўчання.

Свае імпрэзы з нагоды свята зладзілі і ў **Лідскім раёне**. Так, Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці прыняў удзел у акцыі "Вальс Перамогі". Дзеля гэтага супрацоўнікі ўстановы культуры арганізавалі ў раёне святочныя мерапрыемствы і пляцоўкі, дзе ў вальсе кружыліся сотні пар.

Акрамя таго, у самой **Лідзе** прайшоў XIV фестываль нацыянальных культур Лідчыны "Суквецце сяброўства". Дзея адбылася ў рамках святкавання 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

— *З фестывальнай сцэны дарылі сваю творчасць гасцям мастацкія гурты грамадскіх аб'яднанняў палякаў, літоўцаў, украінцаў, яўрэяў, расіян і беларусаў, якія жывуць на Лідскай зямлі*, — пішуць нам супрацоўнікі мясцовага РЦКіНТ. — *Усім творчым калектывам, якія выходзілі на сцэну, а таксама асобным салістам былі ўручаны дыпломы за ўдзел у фестывалі.*

УСПАМІНЫ З ВАЙНЫ І ПРА ВАЙНУ

Працягну тэмы святкавання Дня Незалежнасці інфармацыяй з **Мастоў**. 3 ліпеня яркія і незабыўныя эмоцыі жыхарам і гасцям райцэнтра падарыў "Літаратурны палявы прывал", які быў арганізаваны Мастоўскай раённай бібліятэкай да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Як піша нам метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Мастоўскай "кніжніцы" Вольга Коршун, вялікай папулярнасцю ў гасцей свята карыстаўся галоўны атрыбут пляцоўкі — бібліёбус, стылізаваны пад ваенны аўтамабіль. А асаблівую атмасферу для ўсіх прысутных стваралі супрацоўнікі бібліятэкі, пераапранутыя ў ваенную форму, якія прапаноўвалі кожнаму ахвотнаму паўдзельнічаць у перасоўнай мабільнай анлайн-віктарыне "Я ведаю! Я ганарыся!" Удзельнікамі віктарыны, да слова, былі як дзеці, так і дарослыя, а пераможцам уручаліся прызы.

На "Літаратурным палявым прывале" аматары кнігі і чытання змаглі пагартаць копіі плакатаў і газет ваеннага часу, пазнаёміцца з матэрыяламі выставачнай экспазіцыі "Подзвіг — бессмяротны, памяць — вечная". Дарэчы, Мастоўскай раённай дзіцячай бібліятэкай для маленькіх гасцей была арганізавана гульнявая пляцоўка "Бібліядворык", на якой размясціліся кніжкі-цацкі, дзіцячыя часопісы, настольныя гульні, размалёўкі, батут. Хлопчыкі і дзяўчынкі змаглі пазмагацца ў настольны футбол і аэрахакей, а зона аквагрыму "Чароўныя ўзоры" парадавала дзяцей і дарослых і дапамагла ім пераўвасобіцца ў любімых персанажаў.

У Палацы мастацтваў **Бабруйска** да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь зладзілі музычна-пазнавальную праграму "Мы — дзеці сваёй краіны". Як піша нам загадчыца сектарам па рабоце з дзецьмі ўстановы культуры Вольга Паўкалас, для выхаванцаў школьных лагерах розных устаноў адукацыі райцэнтра былі прадэманстраваны цікавыя музычныя тэматычныя віншаванні.

Разам з усёй краінай адзначылі Дзень Незалежнасці і бібліятэкі Цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы **Браслаўскага раёна.** Святочныя мерапрыемствы, як піша нам загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу Браслаўскай ЦБС Ірына Макарэвіч, прайшлі ва ўсіх філіялах сістэмы напярэдадні 3 ліпеня.

Так, цэнтральная бібліятэка горада прысвяціла гістарычным падзеям разгорнутую кніжную выставу на адкрытай пляцоўцы побач з галоўнай плошчай Браслава, на якой у гэты час адбываўся святочны мітынг. Выстава складалася з раздзелаў, прысвечаных падзеям вызвалення Беларусі, Віцебшчыны і Браслаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, сучасным дасягненням краіны, вобласці і раёна. Да слова, імпрэзы ў фармаце open-air, як абяцаюць браслаўскія бібліятэкары, будуць ладзіцца імі на пастаяннай аснове.

Ад ліста з Браслава пяройдзем да інфармацыі са **Шчучына**. Як піша нам метадыст аддзела бібліятэчнага маркетынгу Шчучынскай раённай бібліятэкі Кацярына Кіселар, у святочны дзень супрацоўнікамі кніжніцы на пляцоўцы ў гарадскім скверы была прадэманстраваная электронная слайд-прэзентацыя "Ваш бессмяротны подзвіг у нашай памяці і ў сэрцы". Названая прэзентацыя з'яўляецца своеасаблівым вынікам віртуальнага марафону сярод бібліятэчных устаноў Шчучынскага раёна, які прайшоў пад назвай "Нам жыць і помніць".

Таксама ў рамках святочных мерапрыемстваў прысутныя ўбачылі відэаролікі з рэдкай кінахронікай вызвалення Беларусі, самымі важнымі падзеямі аперацыі "Багаціён", праектам "Хроніка. Мінск ад Дня вызвалення і да нашых дзён". А для самых маленькіх гасцей свята ў гэты дзень Шчучынская дзіцячая бібліятэка падрыхтавала пазлы, інтэрактыўныя гульні і размалёўкі.

АД СВЯТА ДА СВЯТА

І крыху пра іншыя святы, якія ўсё ж такі ці іначай звязаныя з галоўнай датай мінулага тыдня. Напрыклад, у **Ашмянах** якраз напярэдадні Дня Незалежнасці прайшла акцыя "Дзень вышыванкі". Па меркаванні нашай аўтаркі Інгі Гіз, калі казаць пра асацыяцыі, звязаныя з нашай краінай, то адразу пасля бульбы і буслоў будзе стаяць такая рэч, як вышыванка.

І з гэтымі словамі цалкам можна пагадзіцца. Не надта вядомая яшчэ гадоў дзесяць таму вышыванка цяпер фактычна з'яўляецца адным з найбольш вядомых сімвалаў беларусаў. Не ведаю, як хто, а я часта бачу маладых людзей у майках і тэнісках з арнаментам на вуліцах Мінска. Ды і сам ужо хачу займець сабе такую. А ўвогуле, як піша аўтарка допісу, сёння вышыванка — гэта "візітная картка Беларусі". Таму цалкам зразумела, што сёлетняе свята ў Ашмянах прайшло з поспехам і пры ўдзеле вялікай колькасці маладых людзей.

— *На падобным свяце заўсёды шмат беларускай мовы, музыкі і сімволікі*, — піша Інга Гіз. — *Узоры нават намаляваць на сабе можна было: працавала зона з аквагрымам. Кэст-забег з інтэлектуальнымі іспытамі адкрыў забаўляльную частку праграмы, якая працягнулася канцэртам.*

Яшчэ адна святочная дата ўрачыста адзначалася ў **Светлагорскім раёне**. Адна з вёсак паселішча — Казлоўка — адсвяткавала свой 380-гадовы юбілей. Паселішча, дарэчы, некалі мела іншую, цікавую і незвычайную назву — Глебапечы. Як піша нам бібліятэкар Казлоўскай сельскай бібліятэкі Валянціна Пятрова, галоўнай тэмай святочных мерапрыемстваў сталася 75-годдзе вызвалення вёскі ад фашысцкіх захопнікаў.

На святочную дзею сабраліся не толькі вяскоўцы, а і цяперашнія гараджане. Вялікую зацікаўленасць у прысутных выклікала "Партрэтная галерэя людзей, якімі ганарыцца Казлоўка", што з'явілася ў выніку бібліятэчнага праекта "10 імёнаў Казлоўкі". Шмат ахвотных фатаграфаваліся ў дзвюх фотазонах, падрыхтаваных бібліятэкай. У іх аздабленні выкарыстоўваліся экспанаты бібліятэчнага "Музея малой радзімы": кулямёт, салдацкія каскі, вінтоўкі, кацялок, палатка... Таксама арганічна ўпісалася ў праграму літаратурна-музычная кампазіцыя "Помніць сэрца і ніколі не забудзе", якая нагадала пра падзеі ваеннага часу. А ўзнёслы настрой для ўсіх прысутных стварылі самадзейныя артысты цэнтра вольнага часу і ансамбль "Маладзіцы" Баравікоўскага СДК.

Мяркую, праз некаторы час варта "К" завітаць у Казлоўку і ў даволі цікавы мясцовы Музей малой радзімы. Прычым, не чакаючы святочнай нагоды або 400-годдзя паселішча, а нашмат раней...

К

Надзея БУНЦЭВІЧ

Васіль СЯНЬКОЎ — імя ў сферы нашай эстрады добра знаёмае, хаця ягоны ўладальнік і не любіць пачуваць сябе ў ролі "публічнай асобы" (пра гэта Васіль Георгіевіч гаворыць так: "Грудзі не выстаўляю, ордэны склаў у тумбачку, для мяне галоўнае — справа"). Ён выкладае вакал, займаецца з дзецьмі і больш старэйшымі вучнямі. Зусім нядаўна, 30 чэрвеня, адзначыў 40 гадоў педагагічнай дзейнасці. Пра паспяховасць ягоных методык сведчаць постаці выхаванцаў: заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева, уладальнік медаля Францыска Скарыны, лаўрэат шматлікіх міжнародных конкурсаў Пётр Ялфімаў, Наталля Падольская, у якой добра склалася кар'ера ў Расіі, удзельніца дзіцячага "Еўрабачання — 2014" Надзея Місякова. Нарэшце, нядаўні пераможца расійскага тэлешоу "Бітва талентаў" Мікіта Бялько , запрошаны ў праграму Ірыны Дарафеевай "Акрыляй" на "Славянскім базары ў Віцебску", і многія-многія іншыя.

Вам працаваць ці на тусоўку?

— Васіль Георгіевіч, як вы шукаеце для сваіх выхаванцаў адпаведныя конкурсы? Сёння рознага роду творчых спаборніцтваў стала так многа па ўсім свеце, што галоўным становіцца нават не падрыхтаваць да іх юных зорачак, а знайсці адпаведныя конкурсы, што змогуць прынесці перамогу.

— А я і не шукаю! Гэта розныя рэчы: ёсць тое, што завецца "тусоўкай", а ёсць прафесійная зацікаўленасць. Я менавіта выкладаю, выхоўваю, сачу за станаўленнем і развіццём, але не займаюся раскруткай.

— І што, вашы вучні раскручваюцца самі?

— Для таго ж Мікіты Бялько "Бітву талентаў" угледзела "прасунутая" бабуля: знайшла ў інтэрнэце інфармацыю, што кастынг ужо завяршыўся, але ўсё ж з'явіліся два дадатковыя месцы. Вядома, яны параіліся са мной — і даслалі-такі заяўку. Усяго іх паступіла больш за сотню, але пасля праслухоўвання аўдыёзапісаў засталася роўна палова. У выніку далейшых праслухоўванняў "жыўцом" на адно з тых двух месцаў і патрапіў Мікіта.

— Вы ездзілі з ім на праслухоўванні?

— Не, мы звязваліся па скайпе. У першым туры ўсе ўдзельнікі спявалі хатнія нарыхтоўкі, а далей кожнаму прапаноўвалася тая ці іншая новая кампазіцыя, якую трэба было падрыхтаваць за тры дні. І так — чатыры туры. У кожным неабходна прыпаднесці песню так, каб яна не была падобная да арыгіналу. Апошняй Мікіце дасталася песня Дзімы Білана. Я перайначыў у ёй усё, што магчыма, дзесьці нават узяў лішку. Але Мікіце падказалі, што спачатку лепей нагадаць былы варыянт — і ўсё атрымалася. Асабліва прыемна, што хлопчыка вылучылі многія расійскія дзеячы эстрады, бо на кожным туры гэтага шоу было новае журы. І папярэдне не абвяшчалі, хто ўвойдзе ў яго склад, таму неяк арыентавацца на нечыя густы было немагчыма. Увогуле, таленавітых дзяцей у нас многа, трэба толькі павярнуцца да іх тварам!

— Вось адсюль, калі ласка, як мага больш падрабязней. Што вы маеце на ўвазе? Апошнім часам у галіне дзіцячых эстрадных спеваў робіцца столькі, колькі ніколі раней: безліч студый, разнастайных конкурсаў, праслухоўванняў, магчымасць канцэртных выступленняў. Незразумела толькі, куды потым гэтыя дзеці знікаюць.

— Усё менавіта так, і агульны "сярэдні" ўзровень у нас вельмі і вельмі высокі. Каго ні прывялі б займацца, педагогі з кожнага зробяць штосьці прыстойнае, знойдуць сцэнічную пляцоўку і таму падобнае. Гэта цудоўна! Але калі дзіця падрастае, аднаго толькі замілавання (маўляў, такі маленькі, а спявае) ужо недастаткова. Паўстае пытанне творчай індывідуальнасці — тут і пачынаюцца праблемы. Бо ў спевака павінны быць дзве рэчы: энергетыка і адметны тэмбр. Гэта прадыктавана прыродай, і нічога з гэтым не зробіш. Давайце па шчырасці: ёсць нацыі спеўныя, а ёсць не вельмі. Голас — надзвычай тонкая матэрыя, і перадумовы яе стварэння заключаюцца ўжо ў самой геаграфіі, у кліматычных умовах, у звязанай з імі генетыцы. Украінцы, грузіны, казахі — гэта ўсё спеўныя нацыі. А палякі — не, тыя больш танцавальныя. У нашых спевакоў — гучанне больш "памяркоўнае".

— Дык што з гэтым рабіць — няўжо ўвогуле не спяваць?

— Не трэба кідацца ў крайнасці. Лепей паслухаць, хто і як спявае, і далей працаваць найперш з тымі, каго прырода надарыла больш шчодра. Так, у нас пастаянна праводзяцца нейкія кастынгі, праслухоўванні, шукаюцца таленты. Але найперш сярод тых, хто сам прыйшоў ці каго бацькі прывялі. А такая самаацэнка і ацэнка збоку — розныя рэчы. Паслухайце хаця б тых жа вулічных музыкантаў! Сярод іх сустракаюцца сапраўдныя самародкі, якія самі на нейкі там адбор ніколі не пойдуць: ім гэта не трэба, ім і так добра. Бо самаацэнка і прафесійная ацэнка збоку — гэта таксама розныя рэчы. Неяк стаў нявольным сведкам размовы дзвюх матуль. Адна кажа: "У нас ужо 32 кубкі. — А ў нас — 38!" Самае страшнае — гэта бацькоўскае задавольванне сваіх уласных амбіцый. У падлеткавым узросце "ламаецца" ж не толькі голас — іншым становіцца светаўспрыманне. Дзіця падрастае і раптам разумее, што ўсе тыя ранейшыя ўзнагароды насамрэч нічога не каштуюць, што шлях, які абралі для яго бацькі, — дарога "ў нікуды". Так рабіць нельга!

— Якое ж выйсце?

— Не буду даваць парадаў, падзялюся тым, што раблю сам. Я шмат кансультую, і, калі да мяне прыводзяць дзіця, вельмі сур'ёзна і шчыра размаўляю з бацькамі. Часцяком гавару, што лепей пашукаць іншы занятак. У гэтым сэнсе я прыхільнік некаторых замежных сістэм навучання. Увогуле, лічу, што гадоў да дзесяці дзіця павінна пераспрабаваць усё: музыку, танцы, маляванне, спорт, гурткі па хіміі, батаніцы — чым больш, тым лепей. Бацькі ж павінны назіраць, што яму падабаецца больш, дзе ў яго атрымліваецца лягчэй — не праз жудасныя намаганні, а нібы само па сабе. У той бок і трэба развіваць дзіця далей! Гэта значыць, знайсці яму добрых педагогаў, падтрымліваць, стварыць спрыяльныя ўмовы. І пачынаць уласна прафесійную падрыхтоўку, разлічваючы на цалкам свядомы выбар дзіця. Чым далей, тым больш разумею, наколькі важна гэта трыяда: педагог — вучань — бацькі. Самародкі — людзі звычайна складаныя. Талент — бы тое дзіця, прычым у любым узросце.

— Але ж і каб выкладчыкам быць — аднаго толькі дыплома недастаткова. Павінна быць прызванне?

— Памятаеце прыказку? Няма дарогі — ідзі ў педагогі. Дрэнна, калі атрымліваецца менавіта так. На маю думку, галоўны паказальнік — да гэтых людзей павінна цягнуць. Найноўшая інфармацыя, разнастайныя методыкі даўно перасталі быць нейкім сакрэтам, усё гэта сёння агульнадаступнае. Місія педагога — у індывідуальным падыходзе, у развіцці таго лепшага, што ёсць у чалавеку. Чую, што ёсць у дзіця хаця б дзве ноты прыгожыя, адметныя, чапляюся за іх — і ўсе астатнія "падганяю" да гэтага тэмбру. Бо ведаю, як павінна гучаць усё разам, і развіваю гэта разуменне ў вучнях. Так, ёсць розныя школы, але галоўная з іх павінна быць у галаве вучня: калі ён унутраным слыхам чуе, да чаго трэба імкнуцца, ён гэтага абавязкова дасягне. Той жа Мікіта Бялько — піяніст, вучыцца ў Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Усе гады свайго акадэмічнага навучання ён скіраваны на прыгажосць, выразнасць гуку і добра ведае, якім павінна быць гучанне. Гэта вельмі дапамагае — як і тое, што выкладчыкі згаданай установы з разуменнем ставяцца да яго эстрадных захапленняў, не перашкаджаюць яму развівацца ў абраны бок. Зараз у хлопчыка мутацыя, але мы заняткаў не кідаем. У яго з'яўляецца прыгожы барытон. А як што складзецца далей — паглядзім.

> *— Памятаеце прыказку? Няма дарогі — ідзі ў педагогі. Дрэнна, калі атрымліваецца менавіта так. На маю думку, галоўны паказальнік — да гэтых людзей павінна цягнуць.*

— Як склалася ў вас самога? Чаму сталі выкладчыкам?

— Я жыў у Магілёве, у юнацтве ў мяне было некалькі сваіх гуртоў, выступаў і ў рэстаранах. А як вярнуўся з арміі, трэба было кудысьці ўладкавацца, і мне прапанавалі пайсці ў Магілёўскі Палац піянераў: маўляў, пазаймайся з дзецьмі. Так і закруцілася. Нэлі Бардунова вяла там хор, і мы з ёй пачалі складаць з дзяцей і падлеткаў ансамблі. Усё гэта вырасла ў студыю "Вясёлка", з якой у свой час пачынала тая ж Іна Афанасьева. Потым я выкладаў у тамтэйшым ліцэі музыкі і харэаграфіі, стварыў там студыю "Дубль W", у складзе якой быў квартэт, дзе спявалі юныя Пётр Ялфімаў, Наталля Падольская. Шмат усяго было цікавага!

— Ведаю, ёсць у вас і багаты вопыт працы ў замежжы.

— З "Дубль W" мы шмат выступалі, у тым ліку, на Захадзе. Дзесяцігоддзе я працаваў у Аб'яднаных Арабскіх Эміратах. Яшчэ тры гады — у Аўстрыі, дзе рыхтаваў тамтэйшы "Х-фактар". Вярнуўшыся, выкладаў эстрадны вакал у Беларускім дзяржаўным музычным каледжы імя Глінкі (на той час мы ўжо пераехалі ў Мінск). Сярод маіх выхаванцаў — Даніл Перцаў, які пазней скончыў Лонданскую акадэмію музыкі і цяпер працуе ў Нью-Ёрку, Марыянна Шагурава, якая зараз вучыцца ў магістратуры ў Германіі. Працаваў я і ў сталічным Арт-цэнтры "Крок". Ды толькі зразумеў, што ўсё гэта для мяне не тое, што трэба скіроўвацца выключна на індывідуальныя заняткі па індывідуальнай праграме, а не распрацаванай цэнтралізавана.

— Са сваімі дочкамі таксама ў свой час індывідуальна займаліся? Ці ўсклалі гэта на жонку-музыказнаўцу?

— Мы не жадалі сваім дочкам гэтага лёсу, бо добра разумелі, што ўяўляе з сябе жыццё музыканта. Але калі дзіця ў тры гады цягне ручкі да фартэпіяна і адлучыць ад інструмента немагчыма, дык разумееш, што гэта трэба падтрымліваць. Каця і Віта працягвалі навучанне ў Германіі, цяпер там жывуць і працуюць, склалі фартэпіянны дуэт, шмат выступаюць. А жонка дапамагае мне з маімі вучнямі, бо ў яе свая методыка сальфеджыа, выхавання абсалютнага слыху, заснаваная выключна на логіцы.

— Вы і песні самі пішаце…

— Так, у мяне былі альбомы, але ўсяму — свой час. Як сказаў калісьці Рымскі-Корсакаў, новы час — новыя песні. І я разумею, што калі буду зараз пісаць новыя песні, мяне нявольна пачне цягнуць у мінулае. Навошта? Таму супрацоўнічаю з маладымі кампазітарамі — пераважна з Прыбалтыкі, бо ў іх добры густ, яны больш "заточаны" на лепшыя еўрапейскія здабыткі. З беларускіх аўтараў найперш вылучаю Юзары: у яго вельмі цікавая і незвычайная музыка, адзначаная яго творчай індывідуальнасцю.

— Цікава, што вы пажадалі б маладым спевакам? Добрага рэпертуару? Прызнай усмешкі фартуны?

— Вучыцца падаць. Бо без гэтага не толькі ў творчасці — ва ўсім жыцці немагчыма. Пасля любой няўдачы трэба не шукаць "чужых вінаватых", і ўстаць, атрэсціся — і пайсці далей. Але зрабіць высновы, каб не наступаць на тыя ж самыя граблі двойчы.

К

Не так даўно сумеснымі намаганнямі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры і Смаргонскага райвыканкама на падворку музея-сядзібы Францішка Багушэвіча быў зладжаны ўжо другі "Кушлянскі фэст". За ўзровень яго арганізацыі можна смела ставіць "выдатна". Таму хацелася б пажадаць арганізатарам не спыняцца на дасягнутым, а фестывалю — доўгіх і яркіх гадоў жыцця.
Хоць я і не з'яўляюся "багушэвічазнаўцам", але дзіўным збегам абставінаў давялося і мне патрапіць у спіс запрошаных асобаў. Спрычынілася да гэтага адна знаходка, якую мне пашанцавала зрабіць сёлета. І не дзе-небудзь, а ў горадзе, які змяніў свет. Гаворка пра Вітэнберг, праслаўлены Марцінам Лютэрам. Верагодна, там бываў і наш Францыск Скарына.

Сустрэча на Эльбе,
або Нямецкі след Багушэвічаў
Як інсургенцкі афіцэр стаў "фабрыкдырэктарам"

VON BOHUSZEWICZ

У чэрвені мне надарылася паўдзельнічаць у фестывалі сучаснай культуры "Карані" (а менавіта так перакладаецца з нямецкай яго назоў Wurzel), які ладзіцца ў ваколіцах Ютрабога — гарадка на поўдзень ад Берліна, што захаваў свой славянскі назоў у гонар бога раніцы. У вольную хвіліну намовіў сяброў выправіцца ў недалёкі адтуль Вітэнберг. Так здзейснілася мая даўняя мара — дакрануцца да водаў ракі Эльбы, якая доўгі час была прыроднай мяжой паміж землямі славянскіх плямёнаў (цяперашняя паўночная Нямеччына) і германцамі, якія з поўдня бесперапынна атакавалі славян. Чым, магчыма, справакавалі буйную хвалю эміграцыі тамтэйшага насельніцтва на беларускія землі. Так ці інакш, але ў нас з Германіяй каля 300 тапонімаў-блізнюкоў: Брэст, Кобраў, Крывіч, Мухаў, Тураў, Гамель...

Ужо напрыканцы сваіх агледзінаў Вітэнберга завітаў я на "Новыя могілкі" — новыя яны ўмоўна, бо пахаванні там ёсць і XIX стагоддзя. У стройным шэрагу родавых капліц, якія традыцыйна месцяцца ўздоўж агароджаў цвінтара, маю ўвагу прыцягнуў сціплы мармуровы абеліск. У адрозненне ад большасці сямейных пахаванняў, якія пазбавіліся шыкоўных металічных агароджаў XIX — XX стагоддзяў, тут усё засталося па-старому. Кветнік таксама быў дагледжаным, і падавалася, што літаральна сёння сюды наведваліся руплівыя сваякі.

Адцеміўшы здалля ўсе гэтыя дэталі, я пацікавіўся і прозвішчам пахаванага. З густой зеляніны на мяне пазіралі залатыя літары VON BOHUSZEWICZ...

Шакаваны я не быў. Давалася ў знакі спёка і каля 20 кіламетраў, накручаных па старых вулачках Вітэнберга. Ды і імёны, выбітыя на чорных камянях, усплёску эмоцый не выклікалі: Хуга, Бэці, Алма, Валяр'ян, Артур....

1 Родавае пахаванне сям'і Валяр'яна Багушэвіча, Вітэнберг, Нямеччына.
2 Метрычны запіс хроста Валяр'яна-Юзафата 5 снежня 1841 г. у Рукойнах (нар. 27 лістапада ў Свіранах).

Стоп, назад. Валяр'ян? А год нараджэння? 1842. І вось тады думкі мае завіравалі... Паўстанне 1863-га мінус 21... Па ўзросце падыходзіць. Трэба усё зафіксаваць, тэрмінова знайсці інтэрнэт, праверыць.

І калі я да дабраўся да Сеціва, мая здагадка атрымала падмацаванне. Мяркуючы па ўсім, мне сапраўды пашчасціла адшукаць пахаванне малодшага брата Францішка Багушэвіча, які пасля паразы паўстання быў вымушаны хавацца ад царскіх уладаў у замежжы. А тыя асобы, помнікі якім паўколам атачалі магілу Валяр'яна, належалі да ягонай сям'і.

Пра Валяр'яна ў нас было вядома няшмат. Калі скласці разам усё апублікаванае ў розныя гады Генадзем Кісялёвым, Уладзімірам Содалем, Язэпам Янушкевічам, Васілём Юршам, то біяграфічная нататка пра яго выглядае такім чынам.

Нарадзіўся Валяр'ян-Юзафат у маёнтку Свіраны 27 лістапада (ахрышчаны 5 снежня) 1841 года. Вучыўся разам з Францішкам у Віленскай гімназіі. У 1862 годзе працаваў ашмянскім землямерам, разам з Францішкам і іншымі сваякамі браў удзел у паўстанні, быў унтэр-афіцэрам і камандзірам аднаго з падраздзяленняў атрада Зыгмунта Мінейкі. Пасля паразы паўстання вымушаны эміграваць. Апынуўся ў Нямеччыне, дзе працаваў рахункаводам на фабрыцы, а потым ажаніўся з дачкой яе дырэктара. Меў двух сыноў і дачку. Верагодна, пабываў у брата-фабрыканта і Францішак, які згадваў яго ў сваіх лістах, апублікаваных Язэпам Янушкевічам.

Пасля таго, як да ўлады прыйшоў Гітлер, нашчадкі Валяр'яна былі вымушаныя пацвердзіць, што Багушэвічы не з'яўляюцца яўрэямі. У пошуках доказаў сталі актыўна ліставацца са сваякамі ў Заходняй Беларусі. Нават, нібыта, наведвалі зямлю продкаў. Пазней сувязь з імі абарвалася. Было меркаванне, што фон Багушэвічы сталі ахвярамі нацыянал-сацыялістаў.

Але, як аказалася, гэта далёка не ўсё, што можна распавесці аб нямецкім адгалінаванні роду, прадстаўнікі якога, падобна, і дасюль жывуць у Германіі. Мяркуючы хаця б па дагледжанай магіле на Вітэнберскіх могілках.

ТЭХНАКРАТЫ

Сярод тысяч надмагілляў, якія я ўбачыў на нямецкіх могілках, помнікі Багушэвічаў маюць адметнасць. На іх выгравіраваная пасада, якую займалі на момант смерці і Валяр'ян, і ягоны сын Хуга. Абодва яны былі дырэктарамі фабрык. І гэта толькі падмацоўвае версію, што той Багушэвіч — "наш". Зрэшты, пра ўсё па парадку.

Сямейнае пахаванне ўтрымлівае пяць магілаў. Уласна, сам "фабрыкдырэктар" Ю. Валяр'ян (Ю. — Юзафат), які нарадзіўся 9 снежня 1842 (на год памыліліся), а памёр 8 ліпеня 1910 года. Ягоная жонка Бэці, народжаная Ахенбах, што з'явілася на свет (або была ахрышчаная) 12 чэрвеня 1847 года, а памерла 27 верасня 1933-га — у досыць паважным веку. Артур, які нарадзіўся 31 студзеня 1874 года — як мяркую, іх першынец. З невядомай прычыны, памёр ён на чужыне — ажно ў Сінгапуры — 28 сакавіка 1919 года.

Далей — "фабрыкдырэктар" Хуга (6 чэрвеня 1876 — 29 снежня 1946) і Алма, якая, верагодна, з'яўляецца дачкой Валяр'яна (10 студзеня 1878 — 15 траўня 1961 года).

Як мы бачым, нацысцкія рэпрэсіі не кранулі нямецкіх Багушэвічаў. Магчыма, доказы, прадастаўленыя сваякамі з Кушлянаў, аказаліся дастаткова пераканаўчымі.

Тут пералічаныя не ўсе дзеці, якія з'явіліся ў сям'і Валяр'яна і Бэці Багушэвічаў. Самым вядомым з іх нашчадкаў стаў Оскар. Нарадзіўся ён 19 чэрвеня 1884 года, калі сям'я яшчэ жыла ў Васербілігу, што ў Люксембургу. Але неўзабаве Валяр'ян становіцца дырэктарам фабрыкі керамічных вырабаў у Цане (мястэчка непадалёк ад Вітэнбергу), і Багушэвічы перабіраюцца туды. Там Оскар скончыў гімназію імя Меланхтона (паплечнік Марціна Лютэра), а затым вышэйшую тэхнічную школу ў Берліне. Працаваў як практыкант на розных прадпрыемствах, затым патрапіў у ваенна-марскі флот, дзе напоўніцу раскрыліся яго тэхнічныя здольнасці. Стаў аўтарам некалькіх важных запатэнтаваных адкрыццяў. Менавіта ён, відаць, згадваецца як "Ота, марскі інжэнер-паводнік", які наведваў разам з братам-доктарам Бацькаўшчыну.

Апошнія звесткі пра Оскара датуюцца 1943 годам, калі ён быў дырэктарам нейкай фабрыкі ў Дзюсельдорфе. Іншы Оскар фон Багушэвіч (нарадзіўся ў 1937), які згадваецца ў Дзюсельдорфе пасля вайны і таксама стаў вядомай у "тэхнічным свеце" асобай — хутчэй за ўсё, сын Оскара-1 і ўнук Валяр'яна.

ХТО ВЫ, АХЕНБАХІ?

Як мы ведаем з лістоў сваячніцы Францішка Багушэвіча С.Тамашэўскай, жонка Валяр'яна была дачкой дырэктара фабрыкі, куды брат паэта ўладкаваўся на працу ці то рахункаводам, ці то бухгалтарам. Болей звестак ні пра яго, ні пра сям'ю ягонай жонкі знайсці не ўдалося, таму пакуль што адважуся на гіпотэзу.

Апынуўшыся на чужыне, Валяр'ян адным толькі яму ведамым чынам патрапіў у Дзюсельдорф. Там у тыя часы пасля няўдалага эксперыменту з адкрыццём фабрыкі ў Санкт-Пецярбургу (1818) атабарыўся Герман Ахенбах з жонкай. Быў ён гандляром па прафесіі, але не раз мяняў іх і на нейкі час нават стаў кіраўніком металургічнага завода ў Мангейме. Але пасля вяртання з Расіі, дзе ён меў намер заснаваць фабрыку на грошы, якія ягоная маці атрымала ў спадчыну, Генрых адкрыў у Дзюсельдорфе бровар і гатэль, які стаў месцам збору мясцовай мастацкай грамады.

Увогуле, гэтая галіна Ахенбахаў вядзе непарыўны радавод ад 1410 года. Відаць, род быў мяшчанскі: спадчыннае дваранства кіраўнік імператарскай стайні Бэно (унук Генрыха) атрымаў за выбітныя заслугі ад Вінгельма II толькі ў 1909 годзе.

Такія супадзенні — фабрыка, завод, металургія, блізкасць Дзюсельдорфа ад Васербілігa (усяго 200 кіламетраў), праца ў Дзюсельдорфе сына Валяр'яна Оскара, і дзюсельдорфскі працяг роду Багушэвічаў — наводзяць на думку, што Валяр'ян мог ажаніцца з унучкай (ці нават дачкой) Генрыха Ахенбаха. А калі так, то мае сэнс узгадаць двух сыноў Генрыха — Андрэаса (1815 — 1910) і Освальда (1827 — 1905), якія прынеслі славу дзюсельдорфскай школе пейзажнага жывапісу. Жартам іх называлі Альфа і Амега пейзажаў (па першых літарах імёнаў (Andreas і Oswald).

Цікавы факт: у 1850-х у Андрэаса Ахенбаха браў урокі жывапісу вядомы беларускі мастак Апалінары Гараўскі (1833 — 1900), ураджэнец Міншчыны, шмат твораў якога знаходзіцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Варта бліжэй пазнаёміцца і з адным з сыноў Андрэаса Ахенбаха, Максіміліянам-Францам (1851 — 1898). Маючы выдатныя мастацкія здольнасці, ён спярша праявіў сябе як таленавіты архітэктар. Пазней была служба ў войску ў гусарскіх частках. Потым ізноў архітэктура. І раптам Максіміліян абрывае паспяховую кар'еру, бярэ супраць волі бацькоў шлюб з 15-гадовай дзяўчынай з Франкфурта і цалкам аддаецца оперным спевам. Каб не кідаць ценю на імя сям'і, ён абірае сцэнічны псеўданім Макс Альвары і неўзабаве становіцца адным з самых славутых тэнараў у вагнераўскіх операх. Незалежнасць і своеасаблівасць характару Альвары прыводзіла да спрэчак з жонкай Рыхарда Вагнэра, асабліва гэта тычылася сцэнічнага строю Зігфрыда, ролю якога выконваў спявак. Спяваў ён і Тангейзера, і Трыстана. Памёр ва ўзросце 40 гадоў і быў пахаваны ў Гамбургу, пад чорнай і простай мармуровай стэлай — такой самай, як і на магіле Багушэвічаў.

Цікавы факт: унучка Францішка Багушэвіча Станіслава Тамашэўская згадвала, што яе цётка "вучылася ў Германіі, мабыць, жыла ў Валяр'яна, дзедава брата. Мелася стаць спявачкаю. Нават марыла пра Мілан і тэатр La Scala. Ці то сарваўся ў яе голас, ці то шкарлаціна перашкодзіла яе намеру. Вярнулася дадому і выйшла за дзедавага пляменніка".

Ці адыграў тут сваю ролю Макс Альвары — або гэта ізноў супадзенне? Задача для "багушэвічазнаўцаў".

Але, паўтаруся, такое неверагоднае сваяцтва — усяго толькі мая гіпотэза. Спадзяюся, з часам удасца яе спраўдзіць. Галоўнае, што нашчадкі Валяр'яна Багушэвіча перажылі Другую сусветную. І хто ведае, якія таямніцы знакавага для нас роду могуць захоўваць іх фамільныя архівы.

Зміцер ЮРКЕВІЧ,
гісторык-архівіст

Формула сусветнай скрухі Вадзіма Сідура

Успамін пра адну сустрэчу са скульптарам

10 ліпеня ў Нацыянальным гістарычным музеі адкрылася выстава твораў выдатнага савецкага мастака-авангардыста Вадзіма Сідура (1924 — 1986). Гэты ўнікальны праект пад назвай "Вайна і мір Вадзіма Сідура" ўжо паспелі ўбачыць жыхары Масквы, Пецярбурга, Страсбурга, Берліна, Люксембурга. Прыйшла чарга і нашай сталіцы. Адзначым, што ў Беларусі гэты бліскучы "падвальны нонканфарміст" вядомы мала. Тым больш цікавымі будуць чытачу жывыя ўспаміны вядомага мастацтвазнаўцы Барыса Крэпака пра сваю сустрэчу з мастаком у апошні год яго жыцця.

Барыс КРЭПАК /
Фота Ганны ШАРКО

Выстава працуе па 28 ліпеня.

У красавіку 1986 года ў шапіку на Беларускім вакзале я купіў газету "Маскоўская праўда", дзе рэзка і груба скланялася імя Вадзіма Сідура (хто быў аўтарам артыкула, не памятаю). Прозвішча скульптара было мне вядомае не толькі па скупых расповедах некаторых маіх маскоўскіх калегаў, але і па рэпрадукцыях яго твораў у берлінскім часопісе Bildende Kunst, які я ў той час выпісваў, бо перыядычна ў ім друкаваўся.

Словам, я ведаў, што гэты майстар добра вядомы на Захадзе і практычна нязнаны ў СССР. Ведаў, што ён аўтар такіх авангардных па тым часе твораў, як устаноўленыя ў Германіі экспрэсіўныя помнікі са зварнога жалеза: "Загінулым ад бомбаў" у Касэлі, "Трэблінка" ў Заходнім Берліне, і адкрыты ў мінулым, 1985-м годзе ў Дзюсельдорфе манумент "Той, хто заклікае".

Вядома, усе гэтыя мае веды былі даволі павярхоўнымі. Работ Сідура ў арыгінале я не бачыў. Але, нават мяркуючы па рэдкіх замежных рэпрадукцыях, можна было зразумець, што аўтар тых скульптур — чалавек даволі незвычайны. Узрушыла, напрыклад, кампазіцыя "Загінулым ад кахання". У ёй геніяльна, як мне тады здавалася, была ўвасоблена драма чалавечых сэрцаў: мужчына і жанчына, працятыя адно адным — і такім чынам злучаныя ў адно. Гэтая праца была зусім непадобнай да тых савецкіх тварэнняў, якія "ўпрыгожвалі" тэрыторыю нашай краіны. І ў той жа час ад яе цягнулася нябачная духоўная нітка да помніка "Разбураны горад" нашага земляка Восіпа Цадкіна, які паўстаў у 1950-я ў Ратэрдаме.

Наогул, пра Сідура ў сталічных мастацкіх колах хадзіла шмат розных размоў, здагадак, баек, плётак — асабліва ў сувязі з яго шматгадовым "дзіўным" жыццём у нейкім цёмным і сырым склепе ў Пяроўскім раёне Масквы.

На першым жа пасяджэнні камісіі па мастацтвазнаўстве і крытыцы Саюза мастакоў СССР я паказаў артыкул з "Маскоўскай праўды" свайму калегу, мастацтвазнаўцу Сашу Каменскаму. І нібы між іншым выказаў у размове пажаданне асабіста сустрэцца з Сідурам. Але як гэта зрабіць, для мяне было вялікім пытаннем.

І тут Аляксандр Абрамавіч ні хвіліну не задумваючыся з гатоўнасцю прапанаваў свае паслугі: маўляў, ён ведае Сідура даўно ("нават імёны па бацьку ў нас аднолькавыя...") і з павагай ставіцца да гэтага чалавека-франтавіка, хоць пра яго творчасць пісаць не даводзілася ("не ў межах маіх інтарэсаў...").

Саша вырваў з блакнота аркуш, напісаў фламастэрам кароткую цыдулку Сідуру з просьбай "полассковее" сустрэць і прыняць беларускага мастацтвазнаўцу і паведаміў адрас яго майстэрні. Потым, падумаўшы, "на ўсялякі выпадак" прыпісаў і яго хатні адрас: вуліца Бранская, 4, кватэра 47. І тэлефон. Дасюль памятаю: 245-03-59.

"Дырыжор". 1950 год.

Быў тэлефон у яго і ў майстэрні, але Каменскі сказаў, што мастак падымае слухаўку толькі на ўмоўныя званкі, і гэты код Сашы невядомы. І што лепш за ўсё наогул ехаць без папярэдняй дамоўленасці. А там — як атрымаецца. Ну не атрымаецца, падумаў я — значыць, не лёс...

У гатэлі "Мінск" я пасяліўся ў адным нумары з Анатолем Анікейчыкам. Знакаміты скульптар таксама прыехаў са мной у Маскву на пасяджэнне Цэнтральнай рэвізійнай камісіі Саюза мастакоў СССР, членам якой ён з'яўляўся ад беларускай творчай арганізацыі. Вось я і прапанаваў яму "махнуць" да Сідура разам. Як выявілася, пра гэтую асобу Толя быў начуты куды больш за мяне. Спачатку ён доўга аднекваўся, спасылаўся на этыкет: як гэта так, без запрашэння ўвальвацца туды, дзе цябе зусім не чакаюць. Я сказаў, што ўсю маральную адказнасць бяру на сябе, і тады Толя пагадзіўся.

"Пасля вайны" (з цыкла "Даніна часу"). 1983 год.

І вось, неяк на зыходзе дня мы выправіліся па напісаным Каменскім адрасе. Па дарозе купілі пару бутэлек каньяку, лімоны, сыр і палку вэнджанай каўбасы.

Канчатковая кропка — станцыя метро "Пярова". На Камсамольскім праспекце хутка знайшлі патрэбны нумар дома. Дом звычайны, тыпавы, якіх у сталіцы сотні, насупраць царквы Міколы ў Хамоўніках. А ў двары — той самы падвал, пра які хадзіла столькі легенд.

Падыйшлі да масіўных металічных дзвярэй, пазванілі. Цішыня. Пазванілі яшчэ раз. Зноў ціха. Ужо сабраліся сыходзіць, як раптам пстрыкнуў замок, і дзверы са скрыпам адчыніліся. На цьмяных вузкіх прыступках стаяў гаспадар — чалавек гадоў 60 у працоўным камбінезоне з вялікай чорнай барадой.

Павітаўшыся, я тут жа сунуў яму запіску Каменскага. Той зірнуў на яе, кіўнуў і жэстам запрасіў нас спусціцца ўніз. Майстэрня падалася мне велізарным сховішчам "рукатворнага" металу. То бок, металічных скульптур.

Адразу звярнуў увагу на кампазіцыю, якая ўвасабляла нейкіх жалезных дзівакоў. Як аказалася, гэта былі "Прарокі". Побач — паранены салдат: уражлівая галава-кокан з бінтоў, і толькі аголеная шчыліна рота. Партрэт Эйнштэйна, партрэт інваліда, сямейны партрэт, кампазіцыі "Кулямётчык", "Формула смутку" і "Пасля эксперыментаў", эскізы-"почеркушки" помнікаў і працоўныя мадэлі ў гліне.

Калі ўвайшлі ў памяшканне, да нас насустрач падняўся са старой сцёртай канапы чалавек. Пазнаёміліся і з ім. Гэта быў, як ён адрэкамендаваўся, стары сябра Сідура Лён Карпінскі. "Якое дзіўнае імя!" — падумаў я. А Сідур дадаў:

— Лён Вячаслававіч — журналіст, якіх мала. А яшчэ — былы сакратар ЦК ВЛКСМ, былы супрацоўнік "Праўды", былы член партыі, выключаны гадоў дзесяць таму з яе доблесных шэрагаў за... За што ты выключаны, Лёня?

— За "грамадска шкодныя" выступы. Ды не будзем пра гэта, Вадзік. Лепш давай зладзім стол у гонар гасцей — вунь колькі яны прынеслі ўсяго смачнага. А я пакуль пакажу ім тваю "падвальную экспазіцыю". Згода?

І, звяртаючыся да нас, дадаў:

— Вадзім па сваёй волі праводзіць такія экскурсіі не будзе: не любіць ён гаварыць пра ўласныя працы...

Пакуль Сідур усталёўваў на стале нацюрморт з бутэрбродаў, зеляніны, чарак і каньяку, Карпінскі "каментаваў" скульптуры. Відаць, ён даўно быў тут сваім чалавекам і бліскуча ведаў творчасць свайго сябра. Паведаміў, што ў гэтым "унікальным музеі-склепе" да нас перабывалі дзясяткі і дзясяткі "добрых людзей", сярод якіх Васіль Шукшын і Булат Акуджава, Генрых Бёль і Мілаш Форман, Давід Самойлаў і Фазіль Іскандэр, Юна Морыц і Міхаіл Рошчын, Элем Клімаў і Яўген Веліхаў, Джакама Манцу і Таніна Гуэра, двойчы Нобелеўскі лаўрэат Джон Бардзін...

Не ведаю, як на Анікейчыка, але на мяне гэтыя знакавыя імёны зрабілі моцнае ўражанне...

А яшчэ "экскурсавод" распавёў, што Сідур — не толькі выдатны мастак, але і цудоўны паэт. І тут жа, ля мадэлі помніка "Таго, хто заклікае", гучна і з пачуццём прачытаў ягоныя вершы: *"Я раздавлен / Непокорной тяжестью / ответственности, / Никем на меня не возложенной..."* Далей не памятаю.

Потым ужо, за чаркай, Сідур сам стаў чытаць незвычайныя па філасофскай скіраванасці і рытміцы вершы (без знакаў прыпынку), адзін з якіх я ўсё ж запісаў пад яго дыктоўку: *"Всю ночь мне снилось / Самое важное / Единственное / Объясняющее / Зачем жил / Почему родился / Я наслаждался / Ясностью и простотой / Истины / Проснулся / Ничего не мог вспомнить / Понял/ Больше никогда не узнаю / Смысла / Прожитой мною жизни"...*

Калі я паставіў кропку, Сідур папрасіў у мяне нататнік і моўчкі адрэдагаваў алоўкам запісаны верш, прыбраўшы знакі прыпынку (амаль як Апалінэр) і размясціўшы ўсе радкі строгім слупком.

Затым па нашай просьбе ён пачаў расказваць пра сябе, адразу падкрэсліўшы, што яго "жыццё было далёка не цукар". Нарадзіўся ў Екацярынаслаўлі (пазней — Днепрапятроўск, а зараз — Днепр), да вайны працаваў у калгасе на Кубані, потым токарам у Сталінабадзе (так тады называўся Душанбэ). У 1942-м 16-гадовым юнаком стаў курсантам Туркестанскага кулямётнага вучылішча. У званні малодшага лейтэнанта, камандаваў кулямётным узводам, ваяваў на 3-м Украінскім фронце. Пад Крывым Рогам быў цяжка паранены.

— Таму і нашу бараду, што яна хавае сляды ранення, — раскрыў ён сакрэт сваёй знешнасці. — Куля нямецкага снайпера патрапіла вось сюды (*паказвае на левую скіўіцу*), трохі ніжэй за вочы і скроні. Потым, зараза, прайшла скрозь корань языка і разарвалася вось тут (*паказвае кут ніжняй скіўіцы справа*). Тут і ўтварылася вялікая дзірка. Ведаеце, асколачкі гэтай праклятай разрыўной кулі дагэтуль сядзяць ува мне. Аперацыю зрабілі ў знакамітым ЦИТО, дзе нашы эскулапы геніяльна аднаўляюць страчаныя твары.

Дарэчы, зважаючы на маё мінулае, нехта недзе казаў пра мой нібыта "палкі" інтарэс у мастацтве да ваеннай тэматыкі з акцэнтам на гвалт і жорсткасць, смутак і роспач... Павінен сказаць, што гэта не зусім дакладна. Нават зусім не дакладна. Гэта не цікавасць і нават не абавязак, а проста жыццёвая неабходнасць — як я яе адчуваю. Вось прайшло ўжо шмат гадоў, а я не магу вызваліцца ад таго, што перапоўніла мяне ў той праклятай вайне. Вы бачыце тую кампазіцыю — забінтаваную галаву параненага? Дык гэта ж я — пасля таго бою пад Крывым Рогам...

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выстава **"Іван Стасевіч. Жывапіс".**
■ Выстава **"Уцеха для вачэй, суцяшэнне для душы"** (у рамках экспазіцыі "Мастацтва краін Усходу XIV-XX ст.") — з 11 ліпеня.
■ Выстава Вольгі Шкаруба і Вадзіма Богдана **"Грані рэалізму"** з 12 ліпеня па 11 жніўня.

Філіялы музея

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".**
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў альбо саломапляценні (на выбар) — кожную нядзелю. Пачатак а 12-й.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь".**
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D.**
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці".**
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля".**
■ Маштабны выставачны праект **"Вайна і Мір Вадзіма Сідура"** — з 10 да 28 ліпеня.

■ Выстава ў рамках міжнароднага праекта **"Адчыненыя дзверы: учора і сёння (Türen auf - damals / heute)".** — з 12 ліпеня.

Філіялы музея

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ Абноўленая экспазіцыя **"Гісторыя сацыял-дэмакратычнага руху канца XIX — пачатку XX стст."**
■ Персанальная фотавыстава Уладзіслава Руты **"Гарызонты падзей".** — з 11 да 17 ліпеня.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Сучасная гісторыя Рэспублікі Беларусь: 1991 — 2017 гг.".**
■ Выстава **"Грошы нашага часу: жыццё без лішніх нулёў".**

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт".**
■ Атракцыён **"Лазерны квэст".**
г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Жывыя пявучыя птушкі"** (прыватная калекцыя, г. Маладзечна) — да 4 жніўня.
■ Выстава жывых экзатычных жывёл **"Жыццё з халоднай крывёю"** — да 1 верасня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".
■ Выстава **"Першыя імёны рускага балета"** (з фондаў Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі мастацтваў) — да 30 ліпеня.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавілейская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Іспанская характарная лялька"** (з прыватнай калекцыі Святланы Пінчук) — да 8 верасня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя беларускага кінематографа".**
■ Фотавыстава **"Трансфармацыя"** Віктара Сянькова. — з 11 ліпеня

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"Подзвіг у імя вызвалення"**, прысвечаная 75-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — да 9 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Гістарычны квэст "Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў". Па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Пастаянная экспазіцыя.
Ратуша
Вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выходкі старога захавальніка".** Па папярэдніх заяўках.
Слуцкая брама
■ Часовая экспазіцыя **"Святло"** (падсвечнікі, кандэлябры, шандалы) — да 30 верасня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 90, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"Мірскі замак і яго ўладальнікі: шлях праз стагоддзі".**
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку".**
■ Экскурсія з элементамі анімацыі і дэгустацыі **"Мірскі замак. Гісторыя. Культура. Дэгустацыя".**
■ Тэматычная экскурсія з элементамі квэста для дваіх **"Інтрыгі Купідона".**
■ Музейныя камунікатыўныя праграмы: **"Табе, нашчадак, у добры дар…", "Ад усяго сэрца — самы лепшы пачастунак", "Капрызы моды ракако".**
■ Квэст **"Белы слон".**
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку".**
■ Правядзенне вясельных цырымоній, святкаванне гадавіны вяселля.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**

■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Часовая экспазіцыя **"Стаўбцоўшчына спартыўная".**
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час".**
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску".**
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра".**
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі".**
■ Выстава **"Вітай, зямля беларуская!"** — да 13 ліпеня.
■ Міжнародная выстава **"Маем гонар прадставіць – Аванэс Туманян",** прысвечаная 150 годдзю з дня нараджэння паэта. З 18 да 17 жніўня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
■ Адноўленая экспазіцыя **"Адкрыццё жывапісу"** (візуальная рэтраспектыва творчасці народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва).

■ Выставачны праект з цыкла **"Асабістыя гісторыі" "Мінская прапіска. Частка 1. Happy New Minsk".**
■ Выстава жывапісу, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння Станіслава Манюшкі — да 4 жніўня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**
■ Выстава **"Еўрапейскія баявыя ўмельствы. Ад кузні Вулкана да ўмельстваў Марса"** — да 15 верасня.
■ Выстава жаночых аксесуараў з калекцыі Ігара Сурмачэўскага **"Дамскія штучкі"** — да 15 верасня.
■ Выстава **"Эмі Уайнхаўс: Сямейны партрэт"** — да 31 жніўня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Выставачныя праекты:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**
■ **"Археалагічныя артэфакты ў XII — XIX стст."**

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8-2.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выставачны праект **"Беларускі брыльянт у кароне паладыумных абразоў праваслаўя"** — да 27 кастрычніка.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава аўтарскай выцінанкі Алены Шаліма **"Папяровыя мары "** — да 14 ліпеня.

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г. Навагрудак, вул. Гродзенская, 2.
Тэл. (8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны".**
г. Навагрудак, вул. Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення на Навагрудчыне".**

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча".**
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы".**

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Персанальная выстава мастака-баталіста Уладзіміра Сайко **"Зямля і зерне"**— да 17 ліпеня.
■ Персанальная выстава жывапісу Людмілы Курыловіч **"Светлая радасць душы"** — да 17 ліпеня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ **Рэспубліканская мастацкая выстава**, прысвечаная 75-годдзю са дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — да 14 ліпеня.
■ Выстава жывапісу і графікі Аляксандра Пашкевіча — да 14 ліпеня.
■ Выстава па выніках пленэраў памяці Віктара Сташчанюка — да 14 ліпеня.

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

магазіны "Белсаюздрук"	кіёскі "Белсаюздрук"
Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".	**ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".	**Праспект Пераможцаў, 5.**
Праспект Незалежнасці, 44.	**Вуліца Рабкораўская, 17.**
Вуліца Валадарскага, 16.	**Праспект Незалежнасці, 68, В.**
	Вуліца Лабанка, 2.

ПА ПЫТАННЯХ РАЗМЯШЧЭННЯ РЭКЛАМЫ Ў ГАЗЕЦЕ "КУЛЬТУРА"
звяртайцеся па тэлефоне
+ 375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе
+375 17 334 57 41
альбо пішыце на электронны адрас
kultura@tut.by!

ТЭАТРЫ

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 154 04 44.
■ **14 — УСЁ НАРМАЛЬНА.** Аўтар — Уладзіслава Хмель, рэжысёр — Ганна Якаўлева.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **З 10 да 16 ліпеня** працуе адзін з найцікавейшых праектаў фестывалю "Славянскі базар у Віцебску" — **"Лялечны квартал".**